Новы час | 29 сакавіка 2019 | № 12 (623) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №3

Літаратурная Беларусь

Выпуск №3 (151)
(сакавік)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Права выбару,
або Як я позна адчула сябе беларускай



Людміла АНДЗІЛЕЎКА

Сёння мы разгублена здзіўляемся: «Што здарылася з нашымі дзецьмі?»! Што штурхае іх на нематываваную жорсткасць, бессэнсоўнае забойства кагосьці ці сябе. А жорсткасць, непрыманне іншага, непадобнага, незразумелага — ёсць фашызм, і прыжываецца ён у тым грамадстве, дзе зруйнавана права ВЫБАРУ.

Выбару поглядаў, слова, мовы, думкі, інфармацыі, праўды. Дзе навязліва, з года ў год дэманстратыўна культывуецца фізічная моц, перавага «рэжымнай сілы» і гарлапанства над законам, правамі, досведам і доказам, «удалбліваецца» адзінамагчымае падпарадкаванне адной асобе, аднаму напрамку, аднаму голасу, аднаму кулаку, адной хлусні. І нікуды не схавацца ад гэтай навалы, і не магчыма супрацьстаяць ёй без моцных каранёў.

Перад развалам СССР мы сям'ёй адпачывалі за Ленінградам, у Каннэль-ярвэ. Менавіта там мне выпадкова адкрыўся сакральны сэнс слова *карэнны*. Эканамічны стан дзяржавы пагаршаўся на вачах: карткі, купоны, адсутнасць прадуктаў, фальшывыя грошы, падробка на прылаўках, засілле жулля, прайдзісветаў. І сярод гэтай багны і хаосу нам сустракаліся па сапраўднаму харошыя, чыстыя людзі. Карэнныя жыхары тых мясцін. Яны імкнуліся выручыць, дапамагчы, запрашалі ў дом, давяралі ключы, прапанавалі карыстацца іх пашпартамі. Я адмаўлялася — настойвалі: «Як вы з траімі дзецьмі даедзеце ў Беларусь. Нават ежы не купіш на дарогу». Потым я зразумела, чаму кожная таталітарная бесчалавечная сістэма заўсёды і абавязкова вяла, вядзе і будзе весці вайну з карэнным насельніцтвам, асабліва прыгнечаных краін, будзе праводзіць гвалтоўнае перасяленне народаў, будзе змагацца з любой праявай нацыянальнай адметнасці і самаўсведамлення, бо *карані* не даюць упасці долу, дапамагаюць выстаяць у вятрах і бурах, даюць магчымасць быць абазнаным, заставацца *сабой* і на *сваім* месцы.

Мяне быццам не існавала да нейкага моманту, да таго часу, калі пачало нарэшце даходзіць, што жыву я не ў СССР, а ў сваім краі, што я не дробязны вінцік велізарнага агрэгату, у чэрава якога дзеля застрашвання людзей усяго свету ваеннай магутнасцю патрабуецца закідваць энергетычнае паліва ў выглядзе ўсё новых і новых ахвяр: знішчэнне цэлых народаў, людскіх сіл, жыцця, здароўя, працы, творчасці, шчасця…

Адкрылася нечакана, седзячы на першым міжнародным конкурсе піяністаў, які адбываўся ў Беларусі («Мінская вясна-1996»… я, шматдзетная маці, адукаваны чалавек, дырэктар музычнай школы, празаік (мела публікацыі ў рэспубліканскіх выданнях), мастак (з персанальнымі выставамі), далёка не цёмная істота сярод свайго атачэння, раптам адчула: у нас, у Беларусі, ёсць *свая* культура, свае музыканты, кампазітары, пісьменнікі, паэты, мастакі, навукоўцы?! Далібог, амаль палову жыцця я пакутліва ўтойвала любоў да «малой радзімы» як хваравітую няздольнасць адрачыся ад рудыментаў дзікунства, саромелася ўсяго свайго, нацыянальнага да чырвані на твары. Так цвёрда добрасумленная, паслухмяная школьніца засвоіла ўрок: я ўсяго толькі другасны элемент вялікага і магутнага. Недачалавек, якому, каб наблізіцца да правамоцных абранага грамадства, неабходна пазбавіцца сябе, сваёй радзіннасці, сваёй мовы, сваёй радасці і смутку, бо яны чамусьці саромныя, няправільныя. Ад нараджэння я адчувала калецтва свайго паходжання. З гэтым адчуваннем пачала зжывацца ад першага класа школы, у якую так імкнулася, так спяшалася па веды і… спатыкнулася з веданнем таго, што я — не я, і ўсё, што лічыла сабою — не мае ніякай вартасці. Перш за ўсё мяне перайменавалі ў школе з Люсі ў незнаёмую Людмілу, і я, не любячы новага імя, балюча саромелася свайго ранейшага. Да таго ж, змусілі размаўляць інакш, не так, як сем гадоў размаўляла ў сваёй сям'і. Чаму?! Чаму?!

Мяне быццам не існавала да нейкага моманту, да таго часу, калі пачало нарэшце даходзіць, што жыву я не ў СССР, а ў сваім краі, што я не дробязны вінцік велізарнага агрэгату



Гэта цяпер у Глыбокім аж тры школы, і ніводнай беларускамоўнай, але ўжо ніхто не шкадуе і не пытаецца ў кіраўніцтва краіны: «Чаму?!»

Супала так, што ў той навучальны год, калі я стала першакласніцай, школа спраўляла наваселле ў новым, добра па тым часе ўладкаваным будынку. Школу адразу, яшчэ ў працэсе будоўлі, называлі рускай. А «старая», якая месцілася ў некалькіх маленькіх будынках былой канюшні, лічылася беларускай. Пакрыўджаныя бацькі дзяцей, якіх не пусцілі ў новую школу, узгневаліся, пачалі выказваць нязгоду. Хтосьці хітра-разумны зверху імгненна скумекаў, як накіраваць «негодование и ропот в нужное русло», каб адразу забіць двух зайцоў: суцішыць бацькоў і пазбавіцца ад шкоднай мовы. Да бацькоўскага сходу «старой» школы выкладчыкаў падрыхтавалі, яны «сталі гарой за інтарэсы дзяцей», «выказвалі за бацькоў думкі».

«Доколе мы ходить будем в невеждах? Это как же наши дети будут поступать в вузы? Да их с такой неразвитой речью, косноязыких, не пустят на порог заведений! Неужели нашим детям веками оставаться дремучей деревенщиной!? Вторая школа — русскоязычная! А нам — дурманить детям головы этой мовай?»

Сход скіравалі ў іншы напрамак, бацькоў напалохалі: якая ўжо там школа нумар два, з «наваротамі», трэба дзяцей ратаваць ад цемрашальства! Пра сцюдзёны дашчаты туалет наводшыбе ў цемры, пра тое, што з урока на ўрок прыйдзецца вучням перабягаць праз двор, бо мала, што школа месцілася ў двух адасобленых будынках, — майстэрні, ваенны кабінет, сталовая — усё размяшчалася ў маленькіх дамках, а дзеці, вядома, палянуюцца кожны раз апранацца і будуць бегаць без паліто, і будуць часта хварэць… І шмат, шмат пра што іншае ўжо ніхто не ўспамінаў. Бацькоў падбухторылі. Бацькам ДАЗВОЛІЛІ баставаць супраць роднай мовы. Яны і забаставалі. У 1965 годзе!.. У Савецкай Беларусі!..

Мая мама жадала сваёй дачцэ «шчаслівай будучыні» і далучылася да рускіх «забастоўшчыкаў». У класе было нямала рускіх дзяцей: Глыбокае заўсёды мела шмат заводаў і прадпрыемстваў, а кіраваць імі на ўсіх узроўнях «здольнымі выяўляліся» толькі рускія.

Палова класу ўсё ж наведвала беларускамоўныя ўрокі. А я сядзела невукам дома яшчэ два тыдні. Нарэшце дачакалася! Адвялі мяне ў клас, пасадзілі за парту.

— Дети, что вы видите на картинке? — настаўніца торкнула ўказкай у плакат.

Прыгожанькі чарнявы хлопчык аж падскочыў, трасучы паднятай рукой, так хацелася яму адказаць перад новымі дзецьмі. Ён хадзіў на ўрокі…

— Качка!

— Нет, Миша, неправильно, с сегодняшнего дня ты должен отвечать: «Утка».

Гэта быў першы і апошні адказ на ўроках Мішы Грыцкевіча, хлопчыка з маленькай вёскі Жураўнёва. Я вучылася з ім да восьмага класа, мы сядзелі побач, цераз праход, яго выклікалі — Міша ўставаў з-за парты, таропіў вочы ў падлогу, дуркавата ўсміхаўся і ўпарта маўчаў. Атрымліваў чарговую «цугу» (так мы казалі пра двойку), сядаў і бубнеў выдатна вывучаны матэрыял сам сабе пад нос. На Новы год у сёмым класе Міша прыслаў мне паштоўку з прызнаннем у каханні, не ад свайго імя, ад Дзеда Мароза, але хіба хто яшчэ ў той час прызнаўся б у каханні на роднай мове, акрамя Мішы? Да сёмага класа мы ўжо ўсе парабіліся «нямымі», «актыўна, аж ад пятага! класа, ажно па дзве гадзіны ў тыдзень!» вывучаючы родную мову.

Працяг на стар. 9 (3) »



Стыпендыі імя Магдалены Радзівіл

У офісе Саюза беларускіх пісьменнікаў былі ўганараваныя новыя стыпендыянткі Прэміі імя Магдалены Радзівіл: паэткі Вольга Гронская, Марыя Мартысевіч і Ларыса Раманава.

Стыпендыя імя Магдалены Радзівіл для пісьменніц і перакладчыц, заснаваная Саюзам беларускіх пісьменнікаў у 2017 годзе, прызначаная на творчую працу і ўручаецца раз на год. Узрост аўтарак, намінаваных на яе, не абмяжоўваецца.


Спіс кандыдатак і імёны пераможцаў абіраюцца Радай стыпендыі, у склад якой уваходзяць Святлана Алексіевіч (старшыня Рады), Уладзімір Арлоў, Алена Макоўская, Барыс Пятровіч (Сачанка) і Юлія Чарняўская.

У мінулыя гады стыпендыяткамі станавіліся: Таццяна Барысік, Алена Брава, Вера Бурлак, Ярына Дашына, Наста Кудасава, Дар'я Ліс.

Прэс-служба СБП

Сёмы нумар «Новага замка»

Пабачыў свет сёмы выпуск літаратурнага альманаха Гродзенскага аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў «Новы замак».



Галоўны рэдактар і ўкладальнік выдання Янка Трацяк адзначыў, што ўпершыню альманах выйшаў на 277 старонках, а гэта на трыццаць пяць старонак больш, чым ранейшыя…

«У альманаху шмат надрукавана твораў новых аўтараў, якія жывуць у Прынёманскім краі ці родам з Гарадзеншчыны, а гэта — Святлана Адамовіч, Ганна Крофта, Раіса Раманчук, Таццяна Яцук, Таццяна Валенцік, Надзея Чукічова і іншыя. Пашырылася і колькасць літаратурных рубрык. Нумар, мяркую, атрымаўся разнастайным і цікавым», — сказаў Янка Трацяк.

Сапраўды, «Новы замак» гарадзенскіх літаратараў парадуе не толькі аўтараў, але і чытачоў. Бо ў ім ёсць што пачытаць, пачынаючы ад прозы старога горада Віктара Варанца да хронікі літаратурнай Гарадзеншчыны за 2018 год, якую падрыхтаваў Уладзімір Хільмановіч. З новымі вершамі і празаічнымі творамі чытачоў знаёмяць Святлана Абдулаева, Святлана Адамовіч, Юрка Голуб, Галіна Самойла, Сяргей Чыгрын, Уладзімір Васько, Рычард Бялячыц, Мікола Канановіч, Іван Буднік, Янка Трацяк, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Валянцін Дубатоўка, Альжбета Кеда, Віктар Шалкевіч і многія іншыя гарадзенскія літаратары.

Па-беларуску ў альманаху можна прачытаць творы Мікалая Гумілёва, Жака Прэвера, Юльяна Тувіма, Ільдэфонса Галчыньскага. На суд чытачоў свае ўспаміны вынес Аляксей Пяткевіч; пра Ігара Жука і яго творчасць успамінаюць і распавядаюць Людміла Сінькова і Анжэла Мельнікава. Павел Сцяцко даследуе онімы творцаў Гарадзенскай філіі Саюза беларускіх пісьменнікаў і сталых аўтараў «Новага замка». Сяргей Чыгрын друкуе сваю перапіску з Алесяй Бабарэка — дачкой вядомага беларускага пісьменніка Адама Бабарэкі. Алесь Бельскі разважае пра жыццёвы і творчы шлях Сяргея Чыгрына.


Гумарыстычныя творы ад Юркі Голуба, Святланы Адамовіч, Івана Будніка, Янкі Трацяка, Ладзіка Майніча прымусяць усміхнуцца ўсіх, хто гэтыя сатыру і гумар прачытае. З дзіцячымі творамі на старонках «Новага замка» выступаюць Раіса Раманчук і Галіна Самойла.

Першая прэзентацыя «Новага замка» адбылася 23 сакавіка.

Барыс Баль, Радыё Рацыя

Дзённікі Барадуліна 1989–1991 гадоў

2 сакавіка споўнілася пяць гадоў з дня смерці народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна. За некалькі дзён да гэтай даты выйшла ягоная новая — пятая — кніга дзённікаў.



Яе героі — і партыйныя функцыянеры Яфрэм Сакалоў, Мікалай Слюнькоў, Мікалай Дзямянцей, і нацыянальная эліта: Васіль Быкаў, Ларыса Геніюш, Алесь Адамовіч, Генадзь Бураўкін, Карлас Шэрман, Зянон Пазьняк…

На думку даследчыцы і ўкладальніцы барадулінскіх «Дзённікаў і запісаў» Наталлі Давыдзенкі, 1989–1991 гады — бадай, самы цікавы перыяд і ў гісторыі Беларусі, і ў дзённікавых нататках Рыгора Барадуліна.

«Гэта новыя часы, гэта новы голас Барадуліна. Гэта не дзядзька Рыгор памяняўся — змяніўся час. І тут ужо больш «укручанасці» ў грамадскія справы. Але шмат гумару, іроніі — калі б Барадулін мог перачытаць тое, што тут ёсць, — сам бы дзівіўся і рагатаў», — кажа даследчыца ў інтэрв'ю «Свабодзе».

«Кожны новы дзень прыносіў немагчымыя яшчэ ўчора падзеі і здарэнні: «перабудова», «дэмакратыя», «галоснасць», мітынгі і шэсці — на Курапаты, у гадавіну Чарнобыля, Першы з'езд народных дэпутатаў у Маскве… Перад Домам урада галадае (!) рабочы, які патрабуе, каб ягоную тэлеграму зачыталі на з'ездзе. Рыгор Барадулін — сябра БНФ і ўдзельнік ягоных Соймаў. Камуністы пачынаюць здаваць партыйныя білеты… Новы час дае падставы і для новых сатырычных тэм: у «Вожыку» друкуюцца эпіграмы на вядомых персон, набіраюцца вясёлыя і з'едлівыя нізкі «Дзіцячыя цвялілкі для дарослых», «Хвіліны мычання. Жывёльная лірыка» ды іншыя, якія не заўсёды трапляюць у друк, застаючыся ў рабочых блакнотах», — піша ў прадмове да выдання ўкладальніца «Дзённікаў і запісаў» Наталля Давыдзенка.

Лёс звёў юную рэдактарку Наталлю Давыдзенку і ўжо знакамітага паэта Рыгора Барадуліна на пачатку 1980-х, калі Наталля прыйшла працаваць у выдавецтва «Мастацкая літаратура».

«У нас збольшага быў жаночы калектыў і два хлопчыкі, як мы іх тады называлі, — Рыгор Барадулін і Васіль Сёмуха. Гэта быў залаты час. І так па жыцці мы пасябравалі… Вы нават не ўяўляеце, колькі ў Барадуліна было запісаў, нататнікаў, працоўных блакнотаў, папер, тэчак, перапісак! І я даўно казала яму: трэба здаваць рукапісы ў архіў, бо завалы былі — да столі. Нешта я разбірала, выпісвала, сістэматызавала», — узгадвае Наталля Давыдзенка.

І ўжо ў 2000 годзе дзядзька Рыгор з жонкай, Валянцінай Міхайлаўнай, калі ўсе ўжо не працавалі ў дзяржаўных выдавецтвах, запрасілі Наталлю Давыдзенку ў госці ў Вушачы.

«Там таксама было шмат папер. І трапіў мне дзённічак, які падлетак Рыгор пісаў у 8-м класе. Сціплы такі сшытачак. Гэта быў штуршок! І там жа я знаходжу студэнцкі дзённік, 1955–56 гады: вучоба ў БДУ і цаліна. А потым ужо сістэматызаваных дзённікаў не было, былі нататкі, зацемкі. І пачалася апантаная праца», — згадала Наталля Давыдзенка.

У 1970-я Барадулін пачаў ездзіць у Прыбалтыку, а там былі ўжо такія невялікія штодзённічкі, у якіх ён рабіў працоўныя нататкі: каму патэлефанаваць, што зрабіць. Але гэта было фрагментарна. Таму матэрыялы для першых чатырох тамоў давялося збіраць і сістэматызаваць з безлічы крыніцаў: з працоўных нататнікаў, лістоў, зацемак на палях рукапісаў. А вось з 1989 года Барадулін пачаў весці дзённікі ў «чыстым» выглядзе, кожны дзень занатоўваў падзеі, сустрэчы.

— Спадарыня Наталля, з аднаго боку, дзённік — рэч асабістая, прыватная, у нечым нават інтымная. Ці даводзілася вам, рыхтуючы дзённікі да друку, нешта цэнзураваць, рабіць купюры, штосьці «не даваць»? Да таго ж, Барадулін яшчэ вельмі востры на язык…

— Ведаеце, у першых чатырох тамах — амаль не. Было звычайнае савецкае жыццё. А пачынаючы з пятага тома, з 1989 года, у нас усё перакулілася. І гэта выявілася і ў запісах Барадуліна. З 1989 года ён піша кожны дзень. Дый паездак хапае — і ў Кіеў, Маскву, краіны Балтыі, у Кітай, у Парыж. Пяты том — пераломны… Вы запыталіся пра купюры. Ён мог вельмі эмацыйна выказацца. Мы з ім крыху паспелі абгаварыць, што даваць, а што не. Бо дзённікі ён пісаў толькі для сябе. Я разумела, з чым магу сутыкнуцца, я ж не гаспадыня, прывыкла аўтараў паважаць. І частку нейкіх момантаў асабістага жыцця, згадак пра людзей я не ўключала. Я старалася далікатна падаваць матэрыял, але, наколькі гэта магчыма, не «прыгладжваючы» аўтара. Мы з ім абгаварылі, што абразлівыя эпітэты ў кнізе не павінны быць. Кожны чалавек можа пакрыўдзіцца на, здавалася б, любую драбязу. Але ёсць у Барадуліна рэзкія ацэнкі, дасталося ўсім: і сваім, і чужым, камуністам, бальшавікам, недэмакратам, нават ветэранам — «прыпячатаць» ён мог. Ён быў з такім фантастычным чуццём нават не да слова, а да гуку. Як ён умеў перарабляць прозвішчы! Часам я не магла гэта падаць — ён жа не сябрам перайначваў, ну проста не ў брыво, а ў вока. Часам я змякчала, як магла. Некалькі разоў ставіла шматкроп'і замест прозвішчаў. У яго безліч эпіграм, прысвячэнняў, віншаванняў, і не толькі сяброўскіх. Яго ж прасілі, і ён пісаў, вельмі арыгінальна. У мяне іх цэлыя тэчкі. Немагчыма апублікаваць усё, але было б цікава.

Іна Студзінская, Радыё Свабода.

Друкуецца ў скароце

«Паэты планеты» ў Брэсце



У Брэсцкай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. Пушкіна прайшла прэзентацыя серыі «Паэты планеты», што выходзіць у выдавецтве Зміцера Коласа.

У сустрэчы бралі ўдзел Лявон Баршчэўскі, Зміцер Колас, Барыс Пятровіч, Алесь Разанаў. Публіцы былі прадстаўленыя некаторыя выданні з перакладной серыі. Усяго пабачылі свет 53 кнігі аўтараў з розных краін свету. На сустрэчы прысутнічалі аматары паэзіі, сябры абласной філіі Саюза беларускіх пісьменнікаў, навучэнцы брэсцкіх ліцэяў.

Другая сутрэча, што мелася адбыцца ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце, на жаль, была ў апошні момант адмененая адміністрацыяй гэтай навучальнай установы. Такім чынам, са студэнтамі-філолагамі не змог сустрэцца нават славуты выпускнік гэтай ВНУ Алесь Разанаў.

Прэс-служба Саюза беларускіх пісьменнікаў

Права выбару,

або Як я позна адчула сябе беларускай

« Заканчэнне. Пачатак на стар. 1 (7)



Каб мысліць і разважаць, мову трэба адчуваць генетычна і адмалку пашыраць слоўны запас з яе багатай скарбонкі. Школьнае ж вывучэнне чужой мовы мала таму спрыяла, ва ўсялякім разе, у школе тых гадоў і таго моўнага стану грамадства. Мы сталі самымі звычайнымі «быдлосамі»! Мы сароменіся сваёй мовы, а я яшчэ і свайго імя, бо ў галаве засела: усяго, што дома, трэба стыдацца. І я стыдалася. Маці дабаўляла: «Чаму ты, дачушка, не говорыш, як Зоя? Па-руску. Красіва!» І гэта мне гаварыла мая мама, геніяльная казачніца... Яна так умела распавядаць, знаходзіла такія трапныя беларускія словы, што да гэтай пары не ўсе магу згадаць. А мне рабілася балюча ўдвая. Чаму я павінна гаварыць, «як Зоя», значыць, я не такая харошая, і мяне нельга любіць, як Зою, да таго ж ува мне расло і шырылася штосьці ўпартае наконт мовы. Не хацела крыўляцца, пераймаць чужыя словы, фразы.

Маё навучанне супала, да ўсяго, з адукацыйным эксперыментам!.. Нашым першым і другім, і наступным падручнікам стала «Родна́я речь» (зусім не ро́дная!), на кожнай старонцы, у кожным апавяданні чужыя, нязвычныя словы гнялі-палохалі дзіця, прыніжалі невядомасцю, прымушалі адчуваць сябе другасортным «отныне и впредь, то бишь, повсеместно, сплошь и рядом, чай, ведь, не здешнего-то макара...». Мы спявалі толькі рускія песні, глядзелі рускамоўныя фільмы, чыталі рускія газеты і часопісы, чулі толькі пра рускіх артыстаў, спевакоў, музыкантаў. Беларуская мова ў нашым жыцці з'явілася толькі на пятым годзе навучання на дзве гадзіны за тыдзень, і сустрэлі мы яе ўжо не любімай, не чаканай, а прыстарэлай дзеўкай-векавухай, дэравеншчынай.

У сёмым класе нас павезлі на экскурсію ў Віцебск, вадзілі ў музей Шмырова. Нам распавядалі пра партызанскага камандзіра Бацьку Міная. Не пажадала сумясціцца ў маёй галаве геройства з ахвярай — чацвёра дзетак! Прасцей было б зразумець, каб не прадстаўлены фотаздымкам на цаглянай сцяне факт: Бацька Мінай са сваёй новай жонкай-каханкай вясёлыя, сытыя ў абдымку на санях па снезе з гармонікам. Ці здольны нармальны чалавек без паталагічнай цягі да ўлады, без маніякальнага пачуцця значнасці і гіпертрафіраванага гонару дазволіць чужым людзям «велічаць» сябе БАЦЬКАМ?

Пра ўсё так хацелася дазнацца, запытацца, а як?! У каго?! Чамусьці ў нашых мясцінах людзі не любілі партызан. Лічылі, што ў лесе хаваліся ад вайны, прыходзілі ноччу, каб адабраць апошняе, помсцілі аднасяльчанам, з кім да вайны мелі нязгоду, забівалі сведак, узрывалі цягнікі, якімі везлі гвалтам схопленых на працу ў Нямеччыну людзей. Мамін малодшы браток Паўла шаснаццаці гадоў пайшоў у самым канцы вайны з вёскі Прыпернае ў Глыбокае шукаць работу і не вярнуўся. (Да гэтага часу ніхто з радні не ведае, дзе дзеўся хлопец.) Той парой хапалі жыхароў раёна на вываз у Нямеччыну, магчыма, папаўся і Паўла. Партызаны падарвалі цягнік. За падрыў выстралі немцы ў шахт вяскоўцаў і на «айн, цвай, драй...» забілі кожнага чацвёртага, ім аказаўся і Міша, малодшы браток майго бацькі. І як разабрацца ва ўсім: дзе дабро, дзе зло, што праўда, што памылка? Не насмелілася я тады запытацца пра ўсё ў класнай. Уяўляю, што б яна адказала! Не адну сваю думку ў стадыі зіготы загубіла я ад боязі аказацца «няправільнай», смешнай, незразумелай, няздольнай знайсці слова, каб выказацца. Бо сваёй мовы ўжо амаль не памятала, а новую паспрабуй адчуць так, каб розумам і душой размаўляць на ёй. А ў восьмым я скончыла школу, паступіла ў музычную вучэльню, дзе праграма па макаўку перапоўнена спецыяльнымі навукамі, і не да мовы там...

Выкладчыкі беларускай мовы ў школе, ды і ў вучэльні, абавязкова пачыналі ўрокі са здзекліва правіла, складзенага на рускай: «В белорусском языке всё как слышится — так и пишется». Гэтую лухту потым паўтараў кожны дурань! Такая багатая, самаўтваральная складаная мова — і так проста?! «Как слышится...» Дык жа, калі «слышится», а калі думаць і разважаць? Ці гэта нікому і не трэба, не абавязкова — «што загадана, тое і пішы!?»

Пры паступленні ў музычнае вучылішча педагог запытаўся ў мяне, адкуль вытокі майго таленту, ці не было сярод продкаў музыкантаў, я адказала — не, не было. Ён надта здзівіўся: «Так бывае рэдка, каб на няўродным месцы ды штосьці вырасла». А ў сям'і майго дзеда (па маці) Юстына было семера дзяцей, яны рабілі

Каб мысліць і разважаць, мову трэба адчуваць генетычна і адмалку пашыраць слоўны запас з яе багатай скарбонкі. Школьнае ж вывучэнне чужой мовы мала таму спрыяла, ва ўсялякім разе, у школе тых гадоў і таго моўнага стану грамадства. Мы сталі самымі звычайнымі «быдлосамі»!

сваімі рукамі цымбалы, балалайкі, скрыпкі, дудкі, правілі гармонікі, маглі граць на любым інструменце без навукі, адразу «з вуха»! На маіх вачах мама, ўпершыню ўзяла ў рукі балалайку, наладзіла строй і сыграла матыў без пярэдняй спробы. А я адказала педагогу: «Не было музыкантаў!» «А якія ж гэта музыканты?! — думалася мне без кроплі сумневу. — Мужыкі-беларусы, цемната!» Так мне ўдаўблівалі ў галаву ўсё маё жыццё. Як жа мне сорамна, як балюча за той ганебны адказ перад усімі маімі продкамі, якіх я не бачыла, бо ў мяне не было жывых бабуль і дзядоў. Толькі пад склон жыцця пачала разумець, якія гэта былі людзі: добрыя, дружныя, сціплыя, якімі чулымі былі мужчыны з роду Юстына!

Напэўна, адным з самых згубных для беларускай мовы і культуры стаў час, калі Пётр Машэраў, жадаючы вызваліць сялян, замест таго, каб зрабіць больш заможным і перспектыўным жыццё ў вёсцы, распусціў моладзь па гарадах. І пайшлі «новаспечаныя гараджане» ствараць «новую культуру». Скараспелыя на абрусенне «недачалавекі», каб адчуць сябе роўнымі, сарамліва глытаючы нязвычныя для генетычна абумоўленай артыкуляцыі гукі, спяшаліся «загергатаць» з вульгарным акцэнтам, які (проста як на пасмешышча!) прыжыўся ў народзе і закаранеў трывучым пустазеллем: «Гаварат, пракрасна жывём! Моат быць, моат быць... Харошанькава — па нямношку! Сіводня такой празнік, такоя шоу устроили, лучшэ, чэм вчэра и пазавчэра! Вааще, харэ балдзэц, рэбята! Кахда ужэ прэкрацицца разгаворчыкі этай горсткі недавольных!» — аднолькава абражаючы Купалу і Пушкіна. Я не хацела *так* размаўляць. Мой нявёрткі язык беларускі ў школе, дома і паўсюль імкнуўся пазбягаць доўгіх гутарак, размоў з аднагодкамі, каб не зачапіцца аб вуглавата-вострыя рускія «г» і «рь», не паслізнуцца на птушына-шчабятлівых «чь» і «щя», каб не ўжываць чужых для душы слоў і фраз... Ведаць рускую мову хацела, замяніць ёй сваю — *ніколі!* Дарэчы, пра вышэй згаданую «забастоўку»: з усяго класу, а гэта трыццаць «з гакам» чалавек, «в вузы» паступілі толькі шасцёра, нягледзячы на «великий русский».

Я пакутавала ў той час яшчэ неабазнанай, але ўжо грунтоўна ўкаранёнай у маю псіхіку фобіяй: страх немагчымасці выказаць думку. У гэтай фобіі магутныя карані. Адзін з іх сямейны, родавы: асаблівасць людзей, блізкіх да прыроднага ладу жыцця, звыклых працаваць як вол, здавольвацца філасофіяй пастуха, па кацінаму велічна-маўклива сузіраць свет. Другі гістарычны: гвалтоўнае адлучэнне вякамі ўсяго народу ад роднай мовы, на якой толькі і здольны чалавек праз слова пасцігаць і ўсведамляць жыццё ў сабе з вонкавым яго праяўленнем. Страта роднай мовы народам непазбежна нясе правал у генетычнай памяці і немы страх перад працэсам мыслення. Трэці «корань» мае сацыяльна-палітычнае паходжанне: значна прасцей кіраваць «немаўлятамі», навязаць ім якую заўгодна «навукова-абгрунтаваную» хлусню пад сцягам духоўнасці, маралі, прытрымліваючыся якой чалавек вучыцца прамаўляць толькі патрэбныя ўладам фразы лозунгавымі ўзорамі і забывае пра тое, што ён, чалавек, сам па сабе — каштоўнасць.

Моцны ўплыў у «працэсе вызвалення» ад страху перад словам аказала выкладчыца мовы і літаратуры ў музычнай вучэльні. Яе метад быў двухбакова перспектыўны: замацоўваў сістэмай зададзены курс і развіваў веды чужой мовы. Толькі патрабавалася паўтараць зазубраныя хрэстаматыйныя фразы, ні слова не замяніўшы сінонімам! Яна вышкалярвала з нас аратараў чужых думак. Не чытаючы тэкстаў Талстога, Дастаеўскага, Блока, мы здавалі ўступныя экзамены ў ВНУ на выдатна, запраста пісалі сачыненні, абсалютна не здольныя самастойна разумець тэкст, адчуваць *слова*.

Адгукнулася ў маім жыцці тая «забастоўка»... Ніколі я не любіла размаўляць на жаргоне, цуралася моднага ў юнацкім асяродзі слэнгу, затое заўсёды шукала прыгожую фразу... Ішла ў музычную школу дзіцём і падбірала для сваіх думак словы. Потым гэтая гульня праявілася ў сталым жыцці стойкай патрэбай. Думкі часцей прыходзілі ноччу, калі адпачывала ад паўсядзённых клопатаў: я, ужо тройчы мама, падхоплівалася за ноч разоў пяць, шэсць, каб не забыцца, не згубіць фразу, думку, пакідала яе на паперы да раніцы, бо тады яшчэ не ўмела запамінаць іх лагічна альбо асацыятыўна. Так да двух, трох гадзін ночы. Рабіла я гэта толькі для сябе, бо не магла не запісваць: думкі не давалі спакою, прасіліся на паперу, перарасталі сябе, пераўтвараліся, нараджалі новыя сэнсы, патрабавалі ўпарадкавання. Мова, якой я карысталася, вядома, была рускай. Бо мае веды роднай мовы былі не проста дрэннымі — нулявымі. Я атрымала адзіную двойку за ўсе сямнаццаць гадоў навучання па роднай літаратуры, у інстытуце. Шмат чытала з рускай літаратуры, захаплялася яе прыгажосцю і разумела: гэта мова ніколі не стане мне роднай, я не адчуваю яе генетычна так, як павінен адчуваць чалавек з прэтэнзіяй асведамляць сваё жыццё, а родную — не ведаю. Як можа піса́ць чалавек, не ведаючы роднай мовы? Гэта сапраўдная трагедыя, калі ты маеш *што* сказаць, цябе проста разрывае, а ты не маеш на тое СЛОВА! А так многія беларусы. Ведаю людзей, якія ў сталым веку пачынаюць складаць вершы, пішуць апавяданні, але яны малавартасныя па беднасці мовы: альбо «хліпенька» карыстаюцца рускай, альбо трасянкай. Атрыманы «моўны вопыт» і мне часта не дазваляе ўзяцца за жаданую тэму. Паразважаю, прыкіну «слоўнікавы багаж» — і пакідаю задумку.

Па сваёй прыродзе я касмапаліт, мяне больш цікавяць праблемы сусвету, чым адасобленыя нацыянальныя пытанні, аднак ад несправядлівасці ці ў знак чалавечага пратэсту мая душа ў нейкі момант запатрабавала змяніць мову, толькі, напэўна ўжо ніколі, нават у сваёй роднай краіне, я не навучуся не адчуваць сябе другасортным чалавекам...

Людміла Андзілеўка

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 3 (151) | 29 сакавіка 2019 | № 12 (623) Новы Час

Дабрыня заўжды перамагае

Сумная навіна прыйшла з Гомеля: 22 лютага не стала найстарэйшага сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў Міхася Пятровіча Даніленкі, які яшчэ паспеў падрыхтаваць у друк гэтыя свае апаведы... Рада і Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў глыбока смуткуюць з прычыны адыходу найстарэйшага сябра нашай арганізацыі і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.



Фота Алега Белавусава, gp.by

Міхась ДАНІЛЕНКА

Памаранчавая небяспека

Калі адключылі дротавае радыё, Кацярына Ігнатаўна па першым часе бедавала па ім. Раней, перад тым, як гатаваць каву (яна амаль штодзённа варыла яе), абавязкова ўключала яго. Любіла слухаць песні, асабліва тыя, калі яны гучалі па заяўках слухачоў.

— Бабуля, а чаму ты сама не пашлеш заяўку на любімую песню? — аднойчы запытаўся ў яе ўнук Славік. — У цябе ж ёсць любімыя, ці не так?

Чаму? А і праўда. Не задумвалася над тым, што яна і сапраўды можа напісаць у радыёрэдакцыю і папрасіць, каб адшукалі для яе любімы твор, які яна памятае з даўніх гадоў.

Унук як бы падштурхнуў яе да дзеяння, і яна аднойчы наважылася тое зрабіць.

«Я — былая настаўніца, — пачала так пісаць ліст, — шмат гадоў адпрацавала ў школе. Вучыла дзятву любіць родны край, дапамагаць людзям... Нешта ў апошні час развялося шмат злыдняў, такіх, што пройдуць побач і пальцам не паварушаць, каб памагчы слабейшаму чалавеку, які знясілеўшы, прысеў на лаўку...»

Кацярына Ігнатаўна падумала крыху і далей пачала пісаць. Слова за слова, і не заўважыла, як пачала пісаць падрабязна пра сябе. Апавядала, што калі маладзейшай была, то з ахвотаю слухала выступленні Азершчынскага народнага хору, якім кіравала заслужаны дзеяч мастацтваў Таццяна Карнееўна Лапаціна. Успомніла пра тое, як некалі, а дакладней, летам, калі яна, Кацярына Ігнатаўна, са старшакласнікамі запісвала народныя песні і паданні, ёй пашанцавала пабыць у тым казачным краі — у Азершчыне.

То вялікая вёска паблізу Дняпра. І сустрэлася з кіраўніцай хору. І Таццяна Карнееўна расказвала вучням, калі яна палюбіла народныя песні: як яе бацька ганяў плыты ва Украіну.

— Ад бацькі я і навучылася любіць песні. І вы, мае дзеткі, не цурайцеся ўсяго, што стварыў народ, — казала сівавалосая жанчына, — у нашых песнях — сіла народная.

Таму, заканчваючы свой ліст да працаўнікоў радыё, папрасіла: «Вы ўжо там пастарайцеся, дарагія, знайсці адну песню, якую спяваў Азершчынскі хор — а менавіта «Шчабятуху».

— Будуць яны шукаць табе тваю «Шчабятуху», — амаль фыркнуў унук. — Мо яны яе і самі не чулі. Ім лягчэй Пугачыху паставіць ці Кіркора, а для цябе...

— Пабачым, — прымірэнча прамовіла бабуля.

Аднойчы, як звычайна, Кацярына Ігнатаўна крутанула гузік прымача і пачула голас дыктаркі:

— Па просьбе нашай пастаяннай слухачкі перадаем жартоўную песню «Шчабятуха» ў выкананні Азершчынскага народнага хору.

Ёкнула сэрца ад радасці ў жанчыны, і яна адразу ж выгукнула:

— Славік! Дзе ты там? Ідзі хутчэй сюды!

У той час унук ладкаваў заплечнік з кнігамі — збіраўся ісці ў школу.

Але адклаў зборы, прыйшоў да бабулі, якая сядзела ў мяккім крэсле і шчасліва ўсміхалася. Яна, мусіць, у гэты час была ў сваёй маладосці, твар яе асвятлiўся, нібы яго кранулі промні сонца... Унук прытуліўся да яе галавой, радуючыся, што радыё задаволіла бабулеву просьбу...

— А я лячу і шчабячу, — прыемным голасам выводзіла спявачка, насалоджваючы душу былой настаўніцы.

З таго часу мінула шмат часу.

Адключылі даўно тое дротава-праваднoе радыё. Ніхто не ведае, чаму адключылі, чым яно замінала вясковаму люду.

Але Славік купіў сваёй бабулі невялічкі прымач, які можна было ўключаць у разетку. Абрадавў бабулю. Ды ўсё добра здавалася напачатку, але з цягам часу ў бабулі пагоршылася здароўе. Старая пачала горш бачыць, ды і слых пагоршыўся...

Сын, які жыў і працаваў у сталіцы, прывёз маці адмысловыя кроплі. Яна навучылася сама закапваць піпеткай вочы. Кроплі дапамаглі — стала выразней бачыць. Але праходзіў час — і зноў слабеў зрок. Раней за акном на галінкі ліпы садзіліся сініцы ці амялушкі, і яна чула іх шчэбет, а цяпер вочы падводзілі, не бачыла іх...

Бабуля засталася ў кватэры адна, унук яшчэ не прыйшоў са школы. Кроплі скончыліся, а ў запасе не было. І наважылася бабуля схадзіць у аптэку, якая знаходзілася недалёчка ад дома. Але не спяшалася, нечага марудзіла. Уключыла тэлевізар, хацела паслухаць, што скажуць пра надвор'е...

Дыктарка акурат заканчвала гаварыць пра прагноз, але на заключэнне прамовіла:

— Папярэджваем: чакаецца памаранчавы ўзровень небяспекі. Будзьце ўважлівыя і па магчымасці не выходзьце з дому, асабліва гэта тычыцца людзей пажылога веку.

Яна не зразумела, пра што папярэджвала дыктарка. «Памаранчавая небяспека... Прыдумаюць жа, — падумала Кацярына Ігнатаўна з усмешкай, — адкуль можа сыходзіць тая небяспека?..»

Паклаўшы ў кішэню рэцэпт на лекі, пакінула кватэру.

У аптэцы тых кропель не было, аптэкарка прапанавала замяняльнікі. Яна пагадзілася.

Выйшла на ганак, паглядзела вакол. Падалося, што зноў вочы яе пачалі падводзіць — суцэльная шэрань вакол. Нечакана вецер шпурнуў ёй у твар прыгаршчы снегу, як быццам хто штурхануў у спіну. Жанчына здагадалася адступіць назад і прытуліцца ў зацішку да сцяны. А завіруха не спынялася, яшчэ болей узлавалася і падкідвала ўгару снежныя воблакі.

«Пакуль не замяло дарогу, трэба ісці дадому, — падумала яна, — бо прыйдзе Славік, а мяне няма. Што падумае?»

Ступіла на адну прыступку, потым на другую. Ужо не зважаючы на снегакаламуць, пакрысе патэпала да свайго жытла. А снег і сапраўды замёў сцежку, якой яна ішла да аптэкі. Ужо цяжка стала і перасоўваць ногі. Адчула, што стамілася, і побач не было лаўкі, каб прысесці і перадыхнуць...

«Вось што азначала тая «памаранчавая небяспека», — запознена падумала Кацярына Ігнатаўна пра папярэджванне дыктаркі. Не знайшоўшы апірышча, прысела ў гурбу снегу. Як на тое, вуліца ўсцяж пуставала...

Колькі так сядзела, не ведае. Але пачула побач тупат ног і галасы.

— Бабуля, вам блага?

— Вы не можаце падняцца?

Яна паглядзела на дзяцей, пажартавала:

— Якая я вам, дзеці, бабуля? Цётка я — Кацярына.

— Цётачка Кацярына, мы правядзем вас дадому — дзе вы жывяце?

Яна здагадалася — то былі старшакласнікі. З той школы, дзе вучыўся Славік.

Вучні падвялі Кацярыну да яе дзвярэй, развіталіся. Хацелі ісці да выхаду, але яна перапыніла іх, пацікавілася:

— Скажыце, дзеткі, а ці не чулі вы такой песні — «Шчабятуха»?

Яны пераглянуліся, паціснулі плячыма:

— Не, не чулі.

— Будзе жаданне, знайдзіце і паслухайце. Песня пра тое, як людзям памагае дабрыня. І мне яна дапамагла, вашая дабрыня.

Калі ж дзеці пакінулі яе, падумала: «Людзей добрых больш, чымся кепскіх. І так будзе заўсёды... Дарэмна я ў лісце-заяўцы напісала пра кепскіх людзей».

І толькі пасля гэтага ўставіла ключ у адтулінку замка.

Птушкам усё бачна

У апошні год дачка вывозіла яго на балкон.

Каляску на лёгкіх гумавых колах сын прывёз Антону Іванавічу з Нямеччыны. Паслалі сына туды ў камандзіроўку, ну сын і падумаў пра бацьку, які пакутаваў без такога «транспарту». Зайшоў у дабрачынную арганізацыю, паказаў бацькавы паперы.

Сядзіць ветэран на балконе, аглядае навакольле. З дванаццатага паверху яму адкрываецца цудоўная панарама горада. Унізе гудуць легкавікі, фыркаюць дымам, ад'язджаюць і прыязджаюць. Да яго балкона далятае той смярдзючы пах, і ён туліцца да сцяны, каб хоць неяк меней нюхаць тое атручанае паветра...

— Можа, цябе назад, тата, адвезці ў залу, — заглядвае да яго дачка, быццам адчуўшы яго стан і настрой, — шмат машын сёння на пляцоўцы.

— Не, дачка, не трэба. І я, дачка, падумаў пра тое ж — чаму столькі транспарту сабралася сёння ля нашага пад'езда?

— Ведаю, чаму. Першае верасня, навучальны год пачынаецца. Вось і прывозяць бацькі свах дзяцей у гімназію.

— Зразумеў. Перацярплю неяк...

Непадалёк ад іх «каробкі», на пагорку, месціўся трохпавярховы будынак школы. Не, ужо не школа... Раней яна, як і ўсе ў горадзе, была школай. Па нечыім загадзе нечакана ператварылася ў гімназію. А потым з'явіліся яшчэ і ліцэі. Былі інстытуты (сын заканчваў адзін з іх), а цяпер з'явіліся ўніверсітэты. Быццам ад гэтага выпускнікі набывалі больш ведаў. Не разумеў таго Антон Іванавіч, не разумеў...

— Вось я, Нінка, і думаю: ці болей за гэты час стала сярод нас разумнейшых людзей?

— Ну, бацька, пачалося... — дачка незадаволена нахмурыла бровы. — Табе ўсё не даспадобы... Час такі настаў. Наперад рухаемся.

— А не назад? — удакладніў ветэран.

— Не ведаю... Але мне трэба, бацька, на дзяжурства ў бальніцу. Вытрымаеш тут адзін, пакуль я вярнуся?

— А мне што — харчы ёсць, у лядоўні ўсё, што трэба. Едзь сабе спакойна, не турбуйся.

Дачка пачала пераапранацца. Потым нешта клала ў сваю валізу, прыхапіла з сабой парасон — на вуліцы пачынала псавацца надвор'е, а потым пачуў, як шчоўкнула засаўка замка. І ў хаце стала зноў ціха.

Колькі ён думак перадумаў, знаходзячыся на тым балконе!

Колькі ён відовішчаў пераглядзеў, знаходзячыся на вышыні птушынага палёту! Птушкі не залятаі вышэй дванаццатага паверху, унізе махалі крыламі.

Колькі гадоў дамагаўся, каб яму выдзелілі тую каляску. Яму хацелася на вуліцу, падыхаць паветрам, перакінуцца словам з людзьмі, з ветэранамі вайны, распытаць, дзе хто ваяваў...

Ты ж немцы, з якімі ён ваяваў, і падбіў не адзін фашысцкі танк, і выдзялілі яго той інвалідны каляскай. У якасці гуманітарнай дапамогі. Абрадваўся былы танкіст, марыў ужо, як яго дачка ліфтам спусціць на першы паверх, як выкаціць па дарожцы на лужок...

Але аказалася, што будаўнікі не прадугледзелі тое, што ў доме могуць быць калекі ці інваліды: па прыступках Ніна не магла скаціць каляску... Паспрабавала, але не здолела. Села на прыступку і заплакала...

Змірыўся з часам, усцешвала хіба, што балкон быў, з якога ўсё відаць. Відаць будучае, відаць мінулае...

І ўжо як найвялікшае шчасце ўспамінаў той час, калі за тры кіламетры хадзіў у школу. Зрэбную сумачку на плячо — і ў дарогу! Зусім жа малым яшчэ быў. Бацькі не баяліся пускаць яго аднаго, каб ён перабег грэблю. А ён мог спыніцца і доўга слухаць спеў птушак. Як яны тады хораша спявалі!

Яго ніхто не падвозіў да школы, як гэтых вісусаў. Дзеці неяк лянівa і неахвотна вывальваліся з «вольваў» і «мэрсэдэсаў» і пляліся, як пад прымусам, у сваю гімназію. Кім яны вырастуць, калі скончаць вучобу? І хто з іх стане сапраўдным чалавекам? І ці не заслоніць іх розум смага здабываць даляры?

Яму з вышыні птушынага палёту тое бачылася яскрава і дакладна — вышыня ніколі не падманвала. Падумаў толькі: «Мае думкі і прагнозы — нішто. Усё размяркуе Бог — усё Яму падуладна...»

...Антон Іванавіч памёр ціха, як і жыў.

Нялёгка давялося яго спускаць з верхняга паверха. І нават ніхто з тых пераросткаў-гімназістаў, перад якімі ён выступаў напярэдадні Дня Перамогі, не пацікавіўся, каго гэта выносяць на коўдры з іх пад'езда.

Яго, сядзячага, так і вынеслі, быццам ён прыкіпеў да танкіскага сядзення і працягваў ваяваць з ворагам.

Як кажуць: амінь яму! І — вечная памяць!

Перад сусветам...



Васіль ЗУЁНАК



Фота www.pustunchik

***

Зорак міліцэйскія «мігалкі»
Вызначаюць курс на Млечны шлях
Душам, каб пакінуўшы магілкі,
Не блукалі марна па начах.
Не шукалі сцежак абарваных,
Не гукалі незваротны лёс,
Знаці, што сусветная нірвана
Ні зямлі не мае, ні нябёс...
Толькі шлях — нікому не вядомы...
Супачні, стамлёная душа:
Ты нідзе, і ты заўсёды дома...
Толькі здрадліва мяне пакінь спяша...

Спеў

Ён са мной, — чую, чую той спеў,
Як вясна з-пад снегу траву.
Я вярнуцца адтуль не паспеў, —
Там застаўся, і тым жыву.

Сэнс

Хоць і добрыя маю намеры,
А да сэнсу дагрукацца ў дзверы —
Аніяк не магу.

Пэўна, сэнс ужо й сам паверыў,
Што гукаць да ўчарашняй вячэры,
Як скупому быць у даўгу.

Што жыццё ўжо, лічы, мінавала,
Сэнсу ж — кот наслязіў занялалы...
Але сэнс таю ўсёадно:

Не пускаюць дзвярныя завалы?! —
Дык, нібы да каханай бывала:
Дабяруся і праз акно!..

Найвышэйшая з узнагарод

Анатолю Вярцінскаму — стваральніку выдатнага паэтычнага сузор'я, дзе, між іншых, праменяцца зорныя кнігі «Песня пра хлеб» і «Чалавечы знак»...

Знае Бог: Анатоль Вярцінскі
Па жыцці не хадзіў бачком,
Прад уладай не гнуўся націнкай,
Не сядзеў у закутку маўчком.

Гаварыў без прыкрас — а па цэлі —
Праўду з самых высокіх трыбун,
Каб у тых паджылкі трымцелі,
Хто пражэцца ў чыноўны табун.

І тварыў натхнёна, адкрыта,
Рыфму ў верш не гнаў без патрэб:
На́перш трэба пасеяць жыта,
Каб спяваць потым песню пра хлеб.

Ён — паэт! Як належыць паэту,
Музе словам пустым не пыліў —
Знаў да сэрца яе сакрэты,
А зрэдзьчас каньячком весяліў.

Не мамоне — служыў народу,
Не бадзяўся ў тусоўках гуляк.
І вышэйшы за ўсе ўзнагароды —
Мае ён — Чалавечы Знак!

Эфект бязважкасці

Прагрэс душу прагрыз,
Натуры з'еў абрыс.
Прагрэс — жыцця пратэз
І чалавецтва крыз.
Прагрэс — дэлікатэс
На ўсезямным стале
І да разгадкі тэст
Усезямной, — але
Ён па нябесны прыз
Нагамі ўверх палез
І галавою ўніз...

***

Ці ты жыццём, ці ты смерцю наліты, —
Час, нібы яблык спакусы нашчадкам,
Час неадольны, час прагавіты:
Ні берагоў, ні канца, ні пачатку...

Знаю: не ўдасца тваю невымернасць
Мне прыручыць да імгнення зямнога, —
Ды развітацца з вясной, можа, вернеш
Дзень хоць адзін мой? Ці гэта замнога?!.

Нарадзіўшыся...

Не здумай памерці, схаваны зямлёй,
Хоць раз нарадзіўшыся ў гэтым жыцці,
Бо кропля святла ад усмешкі тваёй
Між зор несмяротна і юна ляціць.

Перад сусветам...

Адно, што — не-не! — не палохае неба,
а тайнай пакутнай
Вярэдзіць бязмежжа:
якая ў ім будзе прысутнасць мая
Ці адсутнасць?

Зямныя шляхі непазбежна
зліюцца ў сцяжынку —
Жывым падысці да грудка,
дзе я час адслужыў свой.

І як без мяне ён цяпер?
І куды ён скіруе
Ўсе думы мае?
Ці бяспамятна з імі памру я?

Таму як няўцямны дакор
пытанні свае
шлю ў бясконцасць Сусвету:
Пясчынка, — ну што ж...
Але ўсё ж:
Ці я растваруся між зор,
ці згіну пры гэтым
Бязмэтна?.

***

А кожная вясна — як дзень апошні,
А кожны дзень — не ява, а ўспамін.
І ўжо для неба вольны ты ад пошлін,
І ўжо зямля маўчыць — «бывай, мой сын...».

«Бывай...» — і ўжо расклад
сам Бог не можа
Змяніць, паслабіць, адмяніць... Аднак,
Хай зорнае цікуе раздарожжа,
А мне залёты космасу не ў знак.

А мне вясна як горкі дар зазімкаў,
Пярэдадзень зімовай нематы,
А кожная кваццінка — як слязінка
Аб тым, што будзе і не страціш ты.

Снежаньская фантазія

Хвалі белыя ўзбушаваліся,
Коцяць снежны дзявяты вал.
Лістапад абувае валенкі,
Справы здаў — і хутчэй на вакзал!..

Снежань следам памахвае дуйкаю:
Да сустрэчы праз год, лістадзёр!..

Вось такую зіму прыдумаў я,
А таму — я паэт-фантазёр

І адно ў сакрэце трымаю:
Снежань сённяшні снегу не мае.

Голас

Для мяне наша беларуская літаратура, паэзія — такі клад! У мяне, напэўна, большая палова жыцця звязана з паэзіяй.
Марыя Захарэвіч,
Народная артыстка Беларусі

Нарачанскія хвалі
Яго нашапталі,
Узнімалі
Блакітныя крылы нябёсаў,
Летуценна ў палях
Каласы калыхалі,
Перапёлкі гайдалі
Званочкамі росаў,
Срэбны звон жаўрукі з вышыні паўтарылі,
І зацвердзілі ўсё нарачанскія сосны —
У сугуччы адным:
Захарэвіч Марыя —
Беларускай паэзіі
Голас узнёслы!

Голас, што роднай зямлёй блаславёны,
Матчыным словам і песняй натхнёны,
Голас душы, цеплынёю сагрэты,
Шчыры, глыбінны, зямны, сакавіты,
І сінявой васільковай спавіты,
Голас, што ключык знайшоў да сакрэтаў
Вершаў лірычных, балад і санетаў, —
Слухаюць людзі і самі паэты, —
І ў захапленне прыходзяць пры гэтым!...

Шчасце

Шчасця шмат не бывае, —
Дзеліць Бог пакрысе.
Ах, пабольш бы! — шукаем.
Ды знаходзяць не ўсе...

Даніна

Далёкім нашчадкам даніна —
Тварылася на вякі.
Таміны, як дамавіны,
А ў іх — мерцвякі, мерцвякі...

А ў салаўя...

А ў салаўя на каханне песенны дар —
Праз ноч ні хвілінкі не ўтоіцца ціха.
Эстрады начной — чараўнік і песняр:
Спявае і — за-ча-роў-ва-е —
салаўіху.

А салаўіха пярынкаю кожнай трымціць —
Ні бачыць, ні чуць больш не трэба нікога ёй.
Але ж і такое бывае ў жыцці,
Што захапленне мяжуе з трывогаю:

«А песень зашмат — ці не быць бядзе?..» —
І салаўінаму богу малітца...
А песня песню, як з неба, вядзе, —
І як салаўю тут ад песень адмовіцца?!.

Хай там расце...

Шукаў Зюганаў
У нас заганы,
Шукаў Праханаў
У нас прафанаў, —

Ды не знайшлі.
З тым і пайшлі
Ў сваю Расею
«Вечнае» сеяць.

А нам прасцей:
Хай там расце!

Ад кораня...

Ад кораня чыннага права
Не меў я, каб чын закілзаць:
Не меў належнай паставы,
Як мусіў мне крытык сказаць.

З выглёндам такім — пугу ў рукі
Ды статкам гайда кіраваць;
Калі ж не тупы да навукі,
То й вершык які зрыфмаваць...

Ну што ж, я ў прынцыпе згодны...
Адным тое мог апраўдаць:
Не з гэткага, пэўна, я роду,
Каб пыхай сябе надзімаць.

Яшчэ й падкажу дадаткова:
Каб крэсла чыноўнае мець,
Павінен чын адмысловы
Паставіць подпіс умець.

Ну так, каб было па-мастацку —
Такі «рукапісны Гамер»,
Шэдэўр на магіле брацкай
Усіх уладных папер.

А гэтаму трэба вучыцца,
Руку віртуозна набіць.
Мяне ж абышло тое — быццам
Планіда сказала: не быць!..

Не быць! — подпіс мой нехлямяжы
У факсіміле не звініць:
Прасцяк, — гляне кожны і скажа:
З такім у чыноўных не быць...

Бы крыжык у непісьменных:
Дзве літаркі — нельга прасцей...
Ды подпіс такі, несумненна,
Падробіць кожны круцель!..

Не быць мне міністрам фінансаў,
Тым болей — замежных спраў:
Не толькі паставы нюансы —
А й подпіс не распрацаваў!..

***

Ну вось, здаецца, той — ён самы! — час гарачы,
І з дня на дзень вузее далягляд,
І засталося ўжо зусім-зусім не шмат:
Абгрунтаваць віну, падсумаваць няўдачы...


Было ўсяго!.. Было — не пералічыш,
Ды й сэнс які лічыць — нічога не вярнуць...
І ўсё ж прад вечнасцю па-добраму зірнуць
Сам на сваё стараешся аблічча.

Нарэшце, схамянешся неўспадзеў
І зразумееш: марныя старанні...
Жыццё мільгае, быццам на экране,
Ці ўжо амаль на Страшным тым Судзе...

Дзень за днём...

І тая ж зямля пад нагамі,
І той жа, як быў, зеніт,
Ды ўжо дзень за днём вымагаюць
Браць звыштэрміновы крэдыт...

Таемныя таварыствы



Уладзімір АРЛОЎ

Створаная расейскім царызмам каланіяльная імперыя не была падобная да іншых імперый, пра гэта ведаем з падручнікаў гісторыі. Тагачасныя брытанскія альбо французскія калоніі звычайна знаходзіліся далёка за морамі і акіянамі. Расея ж захапіла суседнія народы, якія часам мелі падобную мову і веру. Гэта дазваляла царскім каланізатарам маскаваць прыгнёт, навязваць паняволеным народам расейскую гісторыю і культуру. Беларусаў-ліцьвінаў хацелі пераканаць, што яны таксама «русские», што жывуць не ў чужой, а ў сваёй дзяржаве. Але на землях былога Вялікага Княства Літоўскага не спынялася змаганне за свабоду. Пра вызваленне роднага краю ад расейскага панавання марылі многія студэнты і выкладчыкі Віленскага ўніверсітэта, а таксама іхнія аднадумцы па ўсёй Літве-Беларусі…

Мары філаматаў

На летніх вакацыях 1817 года два віленскія студэнты — Адам Міцкевіч з Наваградка і Тамаш Зан з-пад Маладзечна — вырашылі згуртаваць сяброў у таемную патрыятычную суполку.

Адам і Тамаш ужо рабілі першыя крокі ў паэтычнай творчасці, здабывалі аўтарытэт сваімі поглядамі і ўчынкамі. Яны хацелі, каб у будучае таварыства ўвайшлі тыя, хто любіў Айчыну і таксама захапляўся літаратурай, філасофіяй ды наогул навукамі.

Увосень, калі пачаліся заняткі ва ўніверсітэце, задума Міцкевіча і Зана здзейснілася. Старшынём згуртавання абралі Язэпа Ляжоўскага, які лічыўся адным з самых таленавітых студэнтаў і ўжо здаў экзамен на навуковую ступень кандыдата філасофіі. Створаную суполку юнакі назвалі таварыствам філаматаў. З грэцкай мовы слова «філамат» перакладаецца як «той, хто імкнецца да ведаў».

Пераважная большыня сяброў суполкі паходзіла з Літвы-Беларусі.

Філаматы пастанавілі: іхняе брацтва аднадумцаў ствараецца «не на хвіліну, не для легкадумнай забавы, а на ўсё жыццё». Спачатку ў статуце таварыства было запісана, што кожны філамат мусіць набываць глыбокія веды сам і дапамагаць таварышам. Але неўзабаве маладыя патрыёты паставілі перад сабой мэту паляпшаць асвету ўсяго роднага краю і такім чынам рыхтаваць яго да барацьбы за вызваленне ад расейскай улады. Яны марылі пра незалежнасць народаў колішняй Рэчы Паспалітай і скасаванне прыгону, ад якога пакутавалі сяляне. Маладыя сэрцы пратэставалі супроць цяжкіх падаткаў, бязлітасных рэкруцкіх набораў, абмежаванняў у правах для жанчын і габрэяў ды іншых усталяваных расейцамі парадкаў.

Надзейнымі дарадцамі моладзі сталі прафесары Віленскага ўніверсітэта Яўхім Лялевель, Ігнат Даніловіч ды Міхал Баброўскі.

Сустрэчы ля вогнішча і навуковыя паседжанні

Штотыдзень філаматы збіраліся на «навуковыя паседжанні». Там яны чыталі не толькі свае даследніцкія працы, але і вершы ды апавяданні. Затым распачыналіся цікавыя гарачыя спрэчкі на розныя тэмы. Каб прыйсці нарэшце да адзінай думкі, спрэчкі звычайна канчаліся галасаваннем. На тых паседжаннях часта абмяркоўвалі новыя творы Адама Міцкевіча, Тамаша Зана, Яна Чачота, якіх ужо ведала ўся Вільня.

Асаблівую ўвагу таварыства надавала вывучэнню гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Юнакі запісвалі народныя песні і казкі, легенды і паданні. Філаматы распрацавалі адмысловую інструкцыю для апісання родных мясцін. Яе таемна надрукавалі ў віленскай базыльянскай друкарні і ўручалі кожнаму новаму сябру арганізацыі. Статут суполкі нагадваў пра неабходнасць ведаць і шанаваць родную мову. У большасці філаматаў такой мовай была беларуская.

Сотні юнакоў збіраліся на вольныя сустрэчы, што ладзілі філаматы ў ваколіцах Вільні. На зялёным беразе ракі або возера, на лясной паляне каля вечаровага вогнішча гучалі вершы і песні, нараджаліся новыя ідэі ды планы.

Да гэтых сустрэч сябры таварыства рыхтаваліся вельмі старанна. Ян Чачот абавязкова складаў займальны сцэнарый з тэатральнымі сцэнкамі, разнастайнымі конкурсамі, спаборніцтвамі, забавамі. Напрыклад, пачуўшы адзін паэтычны радок, трэба было назваць аўтара ўсяго верша. Падбалася юнакам і спаборнічаць, хто каго пераспявае або перетанчыць. Тагачасная віленская моладзь размаўляла пераважна па-польску, бо такой была мова навучання, але ўсе добра ведалі беларускую. Таму, калі Чачот прапаноўваў сцэнарый, напісаны па-беларуску, яго віталі ўдзячнымі воплескамі.

У шчырых размовах маладых віленцаў не раз узнікала думка пра будучы збройны выступ супроць расейскай улады. Да гэтага рыхтаваліся і сябры філіяў (аддзяленняў) таварыства філаматаў, якія дзейнічалі ў Віцебску, Беластоку, Свіслачы

У шчырых размовах маладых віленцаў не раз узнікала думка пра будучы збройны выступ супроць расейскай улады. Да гэтага рыхтаваліся і сябры філіяў (аддзяленняў) таварыства філаматаў, якія дзейнічалі ў Віцебску, Беластоку, Свіслачы. У Полацку сябры такой філіі пашыралі антыўрадавыя вершы. Аднойчы ў самым цэнтры горада нехта расклеіў вершаваныя заклікі скінуць ненавіснае царскае ярмо. Паліцыя здолела знайсці толькі аўтара ўлётак Восіпа Дабашынскага. Гэты юны шляхціч прыняў віну на сябе і не выдаў нікога з таварышаў.

«Прамяністыя» і філарэты

Каб пашырыць уплыў на ліцьвінскую моладзь, філаматы стварылі легальнае (адкрытае) таварыства «Прамяністых». Яго ўзначаліў студэнт фізічна-матэматычнага факультэта Віленскага ўніверсітэта Тамаш Зан. Ён вызначаўся кемлівасцю, вясёлым таварыскім норавам і добрымі здольнасцямі завадатара. «Прамяністыя» абвясцілі, што будуць далучаць моладзь да навукі, падтрымліваць, насуперак каланізатарам, сваю мову і культуру ды змагацца за добрыя паводзіны студэнтаў падчас заняткаў і за сценамі навучальняў.

Адным з галоўных правілаў таварыства была «прыхільнасць да айчыннай зямлі». Яна палягала ў тым, каб «жадаць дабра ўсяму народу, захоўваць карысныя звычаі бацькоў, вывучаць і берагчы роднае слова, помніць славу продкаў і памнажаць яе».

Першая сустрэча, на якую новая суполка запрасіла ўсіх ахвочых, адбылася ў траўні 1820 года паблізу Вільні. Тамаш Зан выступіў у той цёплы вечар з дасціпнай прамовай, што раз-пораз перапынялася выбухамі рогату. Потым юнакоў паклікалі «піць малако»: пад нядаўна зазеленелымі дрэвамі, вакол якіх радасна кружлялі меднакрылыя хрушчы, распачыналася вясёлая балюшка без моцных напояў, затое з гульнямі, спевамі ды шматлікімі жартамі на тэмы студэнцкага жыцця.

Вестка пра новае таварыства імгненна разляцелася па Вільні. Яно хутка расло і праз некалькі месяцаў налічвала блізу трохсот сяброў. «Прамяністыя» сумленна і вынаходліва змагаліся за дасягненне абвешчаных мэтаў. Універсітэцкія выкладчыкі з радасцю заўважылі, што ўвачавідкі палепшала дысцыпліна і на лекцыях зрабілася «ціха, як у вуху». Студэнты больш стрымана і паважна паводзіліся ў храмах і на вуліцах. Калі «прамяністыя» чулі з нечых вуснаў брыдкае слова, яны моршчыліся і затыкалі насы, нібыта вакол дрэнна пахла.

Неўзабаве да таварыства належаў ужо кожны трэці віленскі студэнт. У той час універсітэцкі бібліятэкар, былы паўстанец-касцюшкавец, Казімір Кантрым занатаваў у дзённіку: «Той дурань або лайдак, хто не належыць да «прамяністых», бо гэта добрыя людзі».

Вялікі аўтарытэт таварыства напалохаў кіраўніцтва ўніверсітэта. Там разумелі, што «прамяністыя» не абмяжоўцца адным змаганнем за дысцыпліну і парадак. Баючыся трапіць у няміласць да расейскай улады, рэктар загадаў распусціць «прамяністых». Яны выканалі загад, але амаль адразу аднавілі дзейнасць, зрабіўшы яе таемнай і назваўшыся таварыствам філарэтаў (у перакладзе з грэцкай — тых, хто любіць дабрачыннасць). На чале суполкі застаўся Тамаш Зан, які ўжо заслужыў у сяброў велізарныя давер і павагу.

Цяжка за кратамі вольнай душы

Царская паліцыя падазравала пра існаванне нелегальных студэнцкіх арганізацый, але не магла выйсці на іхні след, бо маладыя змагары былі неблагімі канспіратарамі. Але ў траўні 1823 года грымнуў гром…

У дзень, калі ў 1791-м Сойм зацвердзіў Канстытуцыю Рэчы Паспалітай, адзін з вучняў Віленскай гімназіі напісаў крэйдаю на дошцы: «Няхай жыве Канстытуцыя 3 траўня!» Другі вучань дадаў: «О, які мілы для ўсіх нас успамін!» Трэці вучань дапісаў: «Але няма каму пра гэта ўспомніць».


Пра «абуральныя» паводзіны гімназістаў хтосьці даклаў расейскім уладам. Паліцыя пачала следства і выйшла на след філарэтаў. Арыштаваны сябра суполкі Ян Янкоўскі спалохаўся турмы і выдаў усіх вядомых яму удзельнікаў таварыства. Царскія служкі ў мундзірах схапілі Адама Міцкевіча, Тамаша Зана, Яна Чачота, Язэпа Ляжоўскага, Ігната Дамейку ды яшчэ болей за сотню філаматаў і філарэтаў. Патрыётаў кінулі за краты ў Віленскі базыльянскі манастыр, пераўтвораны ў турму.

Знявoленым юнакам спачувала ўся былая сталіца Вялікага Княства. Сабраныя грошы дапамаглі падкупіць варту, і тая дазволіла вязням пакідаць уначы адзіночныя камеры-келлі і збірацца разам. Найчасцей сыходзіліся ў камеры Адама Міцкевіча, які ўжо быў прызнаным паэтам і пазней па-мастацку распавёў пра тыя цяжкія дні ў паэме «Дзяды».

Філаматы і філарэты вялі шчырыя гутаркі, спрабуючы зазірнуць у сваю будучыню. Потым хтосьці ціха пачынаў песню, і ўсе падхопілі яе. Асабліва натхнёна спявалі патрыятычныя песні-гімны «Хай радасць з вачэй нашых блісне» ды «Пагоня наш сцяг» на вершы Адама Міцкевіча і Міхала Рукевіча. Улюбёнай была і «Песня філарэтаў», напісаная ўжо ў няволі Антонам Адынцом:

Будзем сонцам шчэ сагрэты,
Віват, брацці філарэты,
Што няўдачы па-юнацы
Зносяць для даброт.

Пасля кожнага спеву ў камеры гучалі воплескі аўтарам песняў, галасы якіх толькі што гучалі ў агульным хоры. «Можа, нас чуе і дарагі Тамаш», — пра-



маўляў нехта з вязняў, маючы на ўвазе Зана. Яго трымалі ў няволі асобна, але кіраўнік філарэтаў змог перадаць таварышам, што — каб палегчыць долю астатнім — вырашыў ускласці ўсю віну на свае плечы.

Расейскі суд

Пасля заканчэння следства зняволеных часова выпусцілі на парукі блізкіх і знаёмых. За кратамі засталіся тры «самыя небяспечныя злачынцы»: Тамаш Зан, Ян Чачот і Адам Сузін. Не выйшаў на волю, але з іншай прычыны, і Ян Янкоўскі, што выдаў сяброў на допытах. У Вільні не знайшлося нікога, хто згадзіўся б паручыцца за здрадніка.

У жніўні 1824 года цар Аляксандр І зацвердзіў прысуд, паводле якога дзесяць філаматаў і дзесяць філарэтаў высылалі з роднай Літвы-Беларусі ў аддаленыя губерні Расеі. Айчыну мусілі пакінуць Ян Чачот, Адам Міцкевіч, Язэп Яжоўскі, Язэп Кавалеўскі, Адам Сузін...

Самае цяжкае пакаранне атрымаў Тамаш Зан. Яго пад канвоем адправілі ў далёкі расейскі Арэнбург, дзе першы год галоўны з філарэтаў мусіў адседзець у турме. У апошні вечар перад высылкай у камеру да Тамаша пусцілі родных і сяброў. Ян Чачот пад гітару спяваў толькі што складзеную ім на беларускай мове журлівую развітальную песню:

Ды лятуць, лятуць ды дзікія гусі,
Ды нас павязуць да далёкае Русі...

Расейскі суд пакараў таксама выкладчыкаў, якія дапамагалі і спачувалі маладым патрыётам. Універсітэт і Вільню загадалі пакінуць прафесарам Яўхіму Лялевелю, Міхалу Баброўскаму, Ігнату Даніловічу, Язэпу Галухоўскаму. Звольнілі з працы ўніверсітэцкага бібліятэкара Казіміра Кантрыма, які захапляўся сябрамі таемных таварыстваў і ўпотай даваў ім чытаць забароненыя царскай уладаю кнігі.

Лёсы, вартыя раманаў

Нягледзячы на цяжкія выпрабаванні, шмат хто з філаматаў і філарэтаў не проста на ўсё жыццё захаваў вернасць ідэям і мэтам сваіх таварыстваў, але і дасягнуў вялікіх поспехаў у розных галінах культуры і навукі.

Сусветную славу геніяльнага паэта здабыў Адам Міцкевіч.

Як таленавітага паэта мы шануем і Яна Чачота. Першую кнігу вершаў і песняў ён склаў і перадаў каханай дзяўчыне Зосі Малеўскай яшчэ калі быў зняволены разам з сябрамі ў базыльянскім манастыры. Жыццёвыя нягоды адно загартавалі душу песняра. Надзвычай каштоўныя ў ягонай спадчыне дзве кнігі «Сялянскія песняў з-над Нёмана і Дзвіны» і рыфмаваная гісторыя Вялікага Княства Літоўскага — «Спевы пра даўніх ліцьвінаў», у якой апетыя Міндоўг, Гедзімін, Альгерд, Вітаўт, Давыд Гарадзенскі.

Тамаш Зан пасля турэмнага зняволення плённа займаўся даследаваннямі Урала і стварыў першы ў Арэнбургскім краі музей. Нядаўні кіраўнік філарэтаў здабыў вядомасць як таленавіты горны інжынер, але не пакідаў і паэтычнай творчасці.

Застаўся ў навуцы як прызнаны знаўца Манголіі колішні філамат Язэп Кавалеўскі. Ігнат Дамейка стаў выдатным даследчыкам і асветнікам паўднёваамерыканскай краіны Чылі і быў абвешчаны яе нацыянальным героем.

«Вайсковыя сябры»

Вальналюбныя думкі ды мары філаматаў, філарэтаў і «прамяністых» не зніклі бясследна. Філарэт Міхал Рукевіч, які пазбег высылкі на чужыну, ужо праз год пасля суду над аднадумцамі заснаваў таемнае таварыства «Вайсковыя сябры». У яго ўваходзілі вайскоўцы, чыноўнікі, гімназісты і студэнты. Суполка, што дзейнічала на Гарадзеншчыне і Беласточчыне, пастанавіла змагацца за «вольнасць, усеагульную асвету і дабрабыт».

«Вайсковыя сябры» мелі сувязі з расейскімі таемнымі таварыствамі дзекабрыстаў. Трэба сказаць, што дзекабрысты былі мужнымі людзьмі, але лёс Літвы-Беларусі і беларускага народа мала цікавіў іх. Яны лічылі царскую імперыю толькі «русской» дзяржавай, у якой усе мусяць быць расейцамі і размаўляць на «общепонятном русском языке». Старшыня Паўднёвага таварыства дзекабрыстаў Павел Пестэль сцвярджаў, што «белорусы должны отказаться от права особой народности». Назвы «нерусских народов» імперыі ён прапаноўваў проста скасаваць.

У снежні 1825 года «Вайсковыя сябры» сарвалі прысягу цару Мікалаю І у раскватараваным на Беласточчыне сапёрным батальёне. Міхала Рукевіча і ягоных паплечнікаў Аляксандра Вягеліна і Канстанціна Ігельстрома прысудзілі да смяротнага пакарання, якое замянілі 10 гадамі сібірскай катаргі.

У адным з сваіх палымяных артыкулаў-улётак Францішак Савіч пісаў: «Будзем загартоўваць дух, працаваць да канца жыцця! Хто ведае, дзе і як суджана нам памерці? Магчыма, не адзін з нас сканае пад рукою ка́та! Але няхай і смерць будзе працягам барацьбы за свабоду!»

«Племя сарматаў» і зброя ў Бараўлянах

Прамінула два гады, і ў Віленскім універсітэце ўтварылася таварыства «Племя сарматаў», або «Патрыёты Айчыны». Галоўнай мэтай яно вызначыла вызваленне земляў былой Рэчы Паспалітай. Арганізацыю раскрылі, і яе кіраўнікоў Канстанціна Заху, Адама Траскоўскага і Фелікса Ліга выслалі шараговымі салдатамі ў расейскую армію на Каўказ.

У той самы час браты Аляксандр і Францішак Далеўскія заснавалі «Братні саюз літоўскай моладзі», які інакш называўся «Саюзам свабодных братоў». Галоўная сядзіба таварыства знаходзілася ў Вільні, а філіі дзейнічалі ў Менску, Горадні, Наваградку, Слоніме і Лідзе. Саюз аб'ядноўваў некалькі сотняў студэнтаў, вучняў, шляхціцаў, чыноўнікаў і рамеснікаў. Сваю краіну яны бачылі ў будучыні дэмакратычнай рэспублікай.

Рыхтуючы паўстанне супроць каланіяльнай расейскай улады, «свабодныя браты» наладзілі сувязь з салдатамі Менскага гарнізона і Бабруйскай фартэцы. Пад Менскам, у фальварку Бараўляны, для будучага паўстання выраблялі зброю і адлівалі кулі.

Жандарам удалося разграміць і гэтае згуртаванне, але змаганне працягвалася.

Гартаваць ліцьвінскі дух

Студэнт Віленскай медычна-хірургічнай акадэміі Францішак Савіч стварыў з сябрамі Дэмакратычнае таварыства. Яно абвясціла сябе спадкаемцам справы філаматаў і філарэтаў. У вершы «Там, блізка Пінска, у шырокім полі» Савіч заклікаў паняволеныя народы яднацца, каб перамагчы агульнага ворага:

Ліцьвін, валынец, падайце ж мне рукі.
Так прысягаем на Госпада Бога,
Царам на згубу, панам — для навукі...

Жандары высачылі і схапілі Савіча. Яго выслалі салдатам у царскую армію, што вяла захопніцкую вайну з каўказкімі горскімі народамі. Такая служба пярэчыла ўсім перакананням Францішка. Ён здолеў уцячы і пад чужым імем працаваў лекарам ва ўкраінскім мястэчку Янушпаль на Жытоміршчыне, чакаючы магчымасці пакінуць Расейскую імперыю. Калі стваральнік Дэмакратычнага таварыства ўжо атрымаў замежны пашпарт, у мястэчка прыйшла халера. Ратуючы іншых, ён невылечна захварэў сам.

У адным з сваіх палымяных артыкулаў-улётак Францішак Савіч пісаў: «Будзем загартоўваць дух, працаваць да канца жыцця! Хто ведае, дзе і як суджана нам памерці? Магчыма, не адзін з нас сканае пад рукою ка́та! Але няхай і смерць будзе працягам барацьбы за свабоду!»

Так маглі сказаць вельмі многія з тых, хто гераічна змагаўся з расейскай тыраніяй. Свабода і незалежнасць былі ім даражэй за жыццё.

ГІСТАРЫЧНАЯ ВІКТАРЫНА

1. Як з грэцкай мовы перакладаецца слова «філамат»?
2. Што было запісана ў Статуце таварыства філаматаў?
3. Паспрабуйце апісаць навуковыя паседжанні філаматаў ды іх сустрэчы ў ваколіцах Вільні.
4. Хто такія «прамяністыя»? Як дзейнічала гэтае таварыства?
5. Як узнікла таварыства філарэтаў?
6. Як слова «філарэт» перакладаецца на беларускую мову?
7. Раскажыце пра арышт маладых беларускіх патрыётаў і таемныя сходы за кратамі.
8. Як царскія суддзі пакаралі сябраў таемных таварыстваў?
9. Хто з былых філаматаў і філарэтаў здабыў славу творцы або вучонага?
10. Што вы даведаліся пра «Вайсковых сяброў»?
11. Якія мэты ставілі перад сабой «Племя сарматаў» і «Саюз свабодных братоў»?
12. Хто такі Францішак Савіч? Раскажыце пра ягоны лёс.

Малюнак Паўла Татарнікава



Гэты малюнак адлюстроўвае рэкруцкі зборны пункт у Глыбокім на пачатку XIX стагоддзя. Пад вартай расейскай канвойнай каманды ў горад прыгналы сялянскія юнакі і маладыя мужчыны. Справа цырульнік голіць рэкруту палову галавы, каб у выпадку ўцёкаў няшчаснага было лёгка злавіць. (Дарэчы, ад гэтага ў расейскай мове і пайшоў выраз «забрить в солдаты».) Рэкруты сапраўды часта спрабавалі ратавацца ўцёкамі, бо на пажыццёвую службу ў чужое войска забіралі і зусім падлеткаў, і жанатых мужчын, якія мелі дзяцей.

У правым куце малюнка гаспадарчыя будынкі — лямусы былога радзівілаўскага двара, прыстасаваныя пад армейскія правіянцкія «магазыны» (склады). У такія склады па ўсім нашым краі звозілі забраныя ў беларусаў прадукты харчавання і фураж ды зганялі жывёлу. Збор гэтых велізарных падаткаў меў рабаўнічы характар.

Перад ганкам вялікага гаспадарскага дома штаб-афіцэр зачытвае царскі ўказ пра рэкруцкі набор. Злева каля канвойных вы бачыце хлопца, пераапранутага ў «смурны» рэкруцкі каптан (шынель). З рэкрутамі назаўсёды развітваюцца родныя. Іх праводзяць амаль як на той свет. У развітанні бяруць удзел і некалькі святароў з глыбоцкіх касцёлаў і царкваў.

Ажыццяўленне рэкруцкіх набораў і збору падаткаў каланізатары перакладалі на мясцовую шляхту і сялянскіх старастаў. Такім чынам расейскія ўлады адводзілі ад сябе незадавальненне насельніцтва гэтым гвалтам.

Дзень Падзякі





Томас ВЯНЦЛАВА

Верш пра сяброў

Наталлі Гарбанеўскай

Ніхто чужы на свеце не чужы,
Бо ўсё, што не збываецца наяве,
Нябыт-рака нясе да той мяжы,
Дзе ўсе сваімі будзем неўзабаве.
Шматлюдны дзень за горадам замоўк
І радыё хрыпіць, бо хутка зліва,
І не ўратуюць клямка ці замок,
Бо лета памірае так імкліва.

Якраз такою позняю парой
Збіраюцца разгубленыя госці,
Загубленыя госці... Наш пакой
Элізіюмам будзе для кагосьці.
Хай прывіды ў дрымотнай чарадзе
Між забыццём блукаюць і любоўю —
Схаваюцца ў люстэркавай вадзе
І вынырнуць з глыбіняў залюстроўя.

Хай постаці, паўстаючы з магіл,
Крылатых сёстраў і празорцаў здані, —
Хто на палях тамоў вартуе пыл,
А хто ў палях сухой травою стане.
Жывы брыдзе ў нікуды з ніадкуль
Ці абжывае схованку пустую
Маўчання, што гучнейшае ад куль, —
І, можа, Апалон яго ўратуе.

Мяжой сусвету будуць іх дамы́.
Ноч маразамі закуе адлігу.
Але ў смяротным холадзе зімы
Не здрадзіць мова, не саступіць ліху.
Ім атруцілі думкі, ночы й дні,
Каваным ботам сталь звініць чаканна,
Ды ўсё, што замуруюць камяні,
Іх будучыня знойдзе нечакана.

Яны і ў нашым лесе. Пальцы іх,
Як дрэва, адгукнуцца ў мёртвым крэсле,
Іх голас між галін яшчэ не сціх,
Бо вышынёю сталаю ўваскрэслі
Ў сям'і, дзе ёсць імя для ўсіх дзяцей,
І што зямны ім суд і вырак нечы?
А ўнізе — пустата, і ўсё часцей
Прастору глушаць гукі паражнечы.

Не веру ў беды, верачы сябрам!
Бо ў памяці і ўяўнае магчыма —
Падзелены на ўсіх няісны храм,
Адлегласць паміж светам і вачыма.
Хай зранку ўсё растане й праміне,
І сонца іх сляды з люстэрка змые,
Ды крокі іх сыходзяцца ўва мне,
Нібыта паралельныя прамыя.

Дажынкі шчодры верасень нясе
У горад, што на ўзроўні душ трывае,
І восень ўваходзіць пакрысе
Ў чужыя думкі, вуліцы, трамваі.
Пагойдваюцца баржы на вадзе.
Нервуешся, бы ў нечым вінаваты.
Асенні ліст на ходнік упадзе,
Як рыцарскія гербы, вуглаваты.

1968

* * *

Як ззяе небасхіл, як паліць вочы сквар —
Паўвыспу папалам гарачы поўдзень рэжа.
Салёнай пенаю палацы на ўзбярэжжы:
То знікнуць, то ўстаюць,
нібы ў траве пажар,

Бы выдмы на пяску, бы хвалі на вадзе...
Іх цёмны лексікон цяжэйшы ад людскога.
У памяці глухой нічога і нікога,
І толькі ў глыбіні адвечны рытм гудзе.

Прырода йдзе на штурм.
Раз'ела соль замок.
Маяк на страшны суд склікае, трубнавокі.
Аблогай над зямлёй згушчаюцца аблокі.
У шчыліны дзвярэй пасыпаўся пясок.

1970

Вершы пра каханне

I

Калі ў самоце мудрасць завітае незнарок
і абарваны дыялог яшчэ гучыць на сходах,
на мокры сад без сораму навальваецца
змрок
і над пустым Зарэччам чуеш флейты,
арфы подых.

Калі засохлае ручво пад стромай ажыве,
і кропля прабіваецца праз камень
запацелы,
аркестр блізкага канца гучыць у галаве,
і болей не патрэбныя ні словы, ні іх целы.

На вуснах соль, на лобе кроплі
вільгаці марской.
А горад, як вялізны кіт, быў кінуты
на бераг —
у выгнутай прасторы ўсіх вякоў, перад якой
спыніўся бег шалёных душ, бясконца
блізкіх, белых.

Дзве зоркі паміж вейкамі запаляцца, калі
дзве выпуклыя лінзы нам падораць
свет — і досыць.
Тваё жыццё, як ластаўка, ляціць
вакол зямлі,
сядае на плячо, дрыжыць, нічога больш
не просіць.

Не азірайся, нас даўно скарыў
сусвет стары,
дзе пад канвоем скразнякоў у танцы робім
колы:
аблокаў шэрых кравабег і пульс зямной
кары
ўзялі ў аблогу лёгкія, штурмуюць
альвеолы.

І ўсё вяртаецца. І верш, як памяці сябрук,
схіляе ўлева ўсе дамы́ — і хіляцца стра-
ката.
Над вільчаком рассейваецца змрок, і пара
рук
чапляецца за небасхіл, як за штурвал
фрэгата.

II

Не маю адрасоў, а значыць — і гасцей,
і ямб чужы, як свой, стамляе ўсё часцей,
і навіна з нябёс не выглядае свежай.
Але прастора — тут: яна цячэ ракой,
фарсіруе парог і проста ў мой пакой
з вадою па́дае адлюстраванай вежай.

Трох вымярэнняў рып, хоць латы з іх
надзень, —
да вечара на іх святлом гуляе дзень,
а потым па кутах згушчаецца паволі
спачатку травеньскі, а потым летні
змрок.
Ды пра канец жыцця не думаеш знарок,
бо лямпа на стале — і ты ў ахоўным коле.

Дык не спяшаймася.
Ноч на падстрэшку тчэ.
Цуд не народжаны і дзеці спяць яшчэ.
Паруе цёплы плёс і лета даспявае.
Як лодкі за вадой, сплываюць нашых сноў
пейзажы й галасы, і зразумець наноў
кароткай ночы сэнс наш дзень
не паспявае.

Лавіна вобразаў, і кожны, быццам вой,
узяўшы розумы ў аблогу — мой і твой, —
штурмуе іх: чуваць малітвы, крыкі,
мантры.
А целы нашыя ляжаць, бы камяні,
так блізка, і мурой абрысы ў вышыні,
і больш няважна, што адкрылася
Касандры.

1973

Nel mezzo del cammin di nostra vita

Памяці Канстанціна Багатырова

Я да сваёй сярэдзіны зямной
Вучыўся ў смерці, бы шкаляр на ўроку.
І смерць жыла ў пакоі за сцяной,
Як сваяка, трымала ў поле зроку.
Я прыручаў, карміў з рукі нябыт,
Каб не цяпер, не кропка...
хоць шматкроп'е...
Шторанiцы прыносіў краявід —
Найпрыгажэйшы горад у Еўропе
Усходняй, дзе чарот гніе наўкол,
Дзе моляцца нажу і вераць прэнту,
Дзе машыніст не запаволіць кол,
Бензін гарыць і спальвае дашчэнту.
Я сэнс у ёй знаходзіў і мараль,
Я называў яе сваёй сям'ёю,
Я спаў і еў, я жыў у ёй амаль,
А звыкнуцца не змог, не звыкся з ёю.

Я адчыняю дзверы ў калідор,
Як б'ецца сэрца — пад яе аховай.
Мой родны край так шмат каго памёр,
Што смерць бывае нават выпадковай.

1976

* * *

За мяжой кантынента і часу мяжой
Не адразу мяняюцца сны,
Ды, блукаючы ў мовах, сваёй і чужой,
Не выходзяць на яву яны.

Знік асенняй лагчыны няголены твар,
Знікла з мовы журба яе хвой,
Над раўнінаю смерці вільготны пажар
І за брамай лядовы канвой.

Адступае развязка — і хлусіць наўзбоч:
Паўзямлі, ад якіх не ўцячы.
Перакрочыўшы глобус, ты слухаеш ноч
І каханае цела ўначы.

Слухай шум незнаёмай і роднай крыві,
Толькі ў ёй — застанешся пасля.
Бо адбіткаў тваіх, дзе цяпер ні жыві,
Не пазнаюць Нява і Вялля.

1979

Дзень Падзякі

Балотны, металічны пах наўкол,
А конь травіцу свежую скубае
І восем гаспадынь нясуць на стол
Асенні пачастунак. Штат Агаё.
Выгодныя выходныя. Раса.
Чырвоны колер клёна (ці вагона,
Адсюль не бачна). Позняя краса
Вісконсіна, Дакоты, Арэгона —

І Арыён. Жыцця жахлівы дар
Ідзе лавінай, літасці ніякай,
А ты, што сэрцам лічыш кожны ўдар,
За новую зямлю Яму падзякуй.
Хай краявіды для тваіх вачэй
Нязвыклыя яшчэ, але жывыя.
Бо чым далей ад дому, тым хутчэй
Па Адысею пёс стары завые.

Падзякуй за адказ, што болей не
Гаворыць тваёму глузду нічагутка.
За новую ваду ў тваім збане.
За новую траву, што ўзыдзе хутка.
За камень і пліту, за крыж і глыб
Чужой зямлі, што нам закрые вочы.
За смерць. За ўсё, што мы зрабіць маглі б,
Каб зноў дала жыццё. Як Ён захоча.

За музыку, якую іншасвет
Нам сёння пасылае без падману.
У гэтых прыцемках любы прадмет
Такі ж, як з таго боку акіяну.
Гадзіннікі стаяць па трох кутах,
І вока не памыліцца ў шаленстве,
Знайшоўшы клямку, стол і зорны дах —
Тамсама, дзе знаходзіла ў маленстве.

1979

Пераклаў з літоўскай
Андрэй Хадановіч

Пад залатымі трубамі

Пачатак кінааповесці-фантасмагорыі па матывах гітарычных хронік



Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

Імчыць вершнік. Мільгаюць магутныя дрэвы, узгоркі, палі…

Вершнік у ваўчынай скуры, накінутай на плечы, у скураным шлеме з рагамі час ад часу падносіць да вуснаў медны паляўнічы рог (на ім сляпуча ззяе адбітак сонца), закідвае галаву і трубіць. Гукі ўрачыста ўзлятаюць у неба. Над вершнікам кружляе чорны арол…

— Так наш далёкі продак, найбліжэйшы радца вялікага князя Альгерда, за параду будаваць слаўны горад Вільню атрымаў ва ўладанні столькі зямлі, на колькі будзе чуваць гук ягонага рогу цягам дня… І герб наш адгэтуль — «Трубы»… І чорны арол — знак наш…

Вершнік працягвае свой шлях. Узнімаецца ў неба труба, на якой ззяе сонца… Кружляе ў небе чорны арол.

Высокі худы чалавек з груганом на плячы, захутаны ў манаскі чорны плашч з каптуром, з нянавісцю глядзіць на арла, які кружляе ў небе.

— Замнога табе гонару, паганец. Ніколі не дарую. Заўсёды буду стаяць на тваім шляху.

З пляча Вялікага Інквізітара зрываецца чорны груган. Узлятае ўверх, туды, дзе кружляе арол.

Зноў гучыць труба. Яе залаты бляск асляпляе, нагадвае кругі на вадзе… І застывае малюнкам на гербе «Трубы», які вісіць над камінам.

1529 год. Гербавая зала ў палацы Радзівілаў.

Юры Радзівіл па мянушцы Геркулес, магутнага складу мужчына з рудаватымі валасамі і барадой, адкінуўшыся ў фатэлі з высокай спінкай, гартае цяжкі фаліянт. У Радзівіла перавязана рука — ён толькі што пасля чарговай бітвы. Вакол яго сядзяць і ўважліва слухаюць дзеці — Мікалай Радзівіл Руды і ягоны стрыечны брат Мікалай Радзівіл Чорны, абодва падлеткі, трохі маладзейшая за іх Ганна Радзівіл, а таксама анёлак дзевяці гадоў — Барбара Радзівіл. У крэсле сядзіць жонка Юрыя Радзівіла, Барбара Кола, уладная жанчына з цяжкім падбароддзем і бляклымі блакітнымі вачыма, яна вышывае. Павольна праступаюць на белым шоўку цяжкія гронкі рабіны, бы кроплі крыві. Ля крэсла стаіць паж, Міхал Рашчынскі, які па звычаі трымае малітоўнік сваёй пані і ўважліва прыслухоўваецца да размовы ля каміну. Міхал трохі па-падлеткаваму няўклюдны, але відаць, што вырасце вялікім, дужым, у ім адчуваецца незвычайная моц: і дзікая, мядзвежая сіла, і шчырасць, наіўнасць простай натуры. Ягоны позірк увесь час спыняецца на Ганне Радзівіл, танклявай, гожай, дзёрзкай, якая сядзіць збоку на лаўцы, і адзіная з усіх дзетак круціцца, відавочна нудзіцца ўрокам генеалогіі.

Радзівіл Геркулес працягвае аповед:

— Паводле легенды, наш продак, жрэц князя Гедыміна Ліздзейка, убачыў у прарочым сне Жалезнага Ваўка… Які паказаў месца для пабудовы Вільні.

Мікалай Чорны, хлопец з тонкімі рысамі твару, з «фамільным» радзівілаўскім гарбатым носам, па звычаі падмячае тое, на што іншыя не звярнулі ўвагі:

— Дык што, дзядзечка Юры, Радзівілы паходзяць ад паганскага жраца?

Геркулес паблажліва ўсміхаецца.

— Гэта толькі легенда. Насамрэч першым прыняў герб «Трубы» ваш прадзед, баярын Осцік… Ад назвы маёнтка Трабы. І было гэта пры слаўным князе Вітаўце… І няма, і не будзе роду мацней за наш… Пакуль Радзівілы трымаюцца разам. Як калісьці трымаліся мы — я, мой брат Ян, мой брат Мікалай, мая сястра Ганна Мазавецкая. Адзін я застаўся з іх. Ваш час. Ты, мой сын, Мікалай Руды, і ты, мой пляменнік, Мікалай Чорны, будзеце, як лязо і тронак аднаго мяча.

Браты абменьваюцца позіркамі: адкрыты, шчыры твар гарачага па натуры Мікалая Рудога, засяроджаны, хітраваты — Чорнага.

Увесь гэты час Ганна круціцца на месцы, паглядае за вакно, дзе за ўзорчатымі рамамі пагойдваецца голле дрэў. Тузае на шыі медальён — срэбны арол са смарагдавымі вачыма. Дзяўчынка азіраецца на маці — тая прыдрамала ў крэсле, вышыўка з барвовымі гронкамі рабіны ляжыць на каленях. Пакуль бацька размаўляе з братамі, Ганна ціхенька ўстае. Барбара, якой таксама не вельмі цікава, спалохана глядзіць на сястру. Ганна жэстам кліча яе з сабой. Барбара адмоўна круціць галавою. Ганна ціхенька выслізвае з пакою. Мікалай Чорны кідае пільны хуткі позірк убок — але не выдае сястру. Уцёкі Ганны заўважае і паж Міхал.

Ганна выходзіць у сад. Прабіраецца між дрэў і кустоўя, расхінае голле, усыпанае квеценню, захоплена сочыць за матылькамі. У траве ёй трапляецца здохлая варона — дзяўчынка не выяўляе грэблівасці, схіляецца, тыцкае ў птушку прутком, заглядае ў мёртвыя вока… Ёй цікава — што такое смерць? Відовішча дзіўнае: дзяўчынка-анёлак у белай сукенцы — і мёртвая варона… За княжной, хаваючыся за кустамі, крадзецца Міхал, які таксама пакінуў свой пост, скарыстаўшыся тым, што княгіня заснула. Міхал паглядае з-за голля, як маленькая танклявая княжна ў белай сукенцы гуляе па чароўным садзе. Відаць, што сад і ўвогуле палац толькі будуюцца. Там-сям груды каменя, чуваць гукі будоўлі.

Між тым Ганна выходзіць на невялікую палянку, пасярод якой высіцца незразумелае збудаванне. Штосьці высокае, абстаўленае жэрдкамі. Гэта яшчэ не дарobленая эолава арфа — вельмі складаная па задуме канструкцыя. Блішчаць паміж жэрдак яе пазалочаныя струны, але яшчэ не гучыць музыка ветру… Так, асобныя дзіўныя гукі, падобныя да жаласных крыкаў птушкі. Ля пастамента пакінутыя рабочымі інструменты, чарцяжы.

Збудаванне ўвенчвае выява арла, таксама не дароблeная. Адно залатое пёрка дрэнна замацаванае, амаль адвалілася. Ганна спрабуе яго дастаць, ускараскваецца па жэрдках…

Усё збудаванне са страшэнным грукатам і звонам абрушваецца, Ганна з крыкам спрытна адскоквае — Міхал не паспеў кінуцца на дапамогу.

Да абрушанай эолавай арфы збягаюцца слугі, урэшце прыходзіць сама княгіня, Барбара Кола.

— Зноў шкода ад цябе, Ганна! Твой бацька ўлучыў вам увагу, нягледзячы на свае раны. А ты не цэніш. Цяпер не адкруцішся ад розгаў.

Ганна бялее. Наперад выходзіць Міхал:

— Ваша княская мосць, гэта мая віна. Я тут усё разбурыў выпадкова.

Барбара Кола грэбліва падціскае вусны:

— Ты? Што тут робіш? Здаецца, мой муж памыліўся, калі ўзяў цябе да свайго двара, Міхал. І каб не тое, што твой бацька загінуў, ратуючы князя… Спадзяюся, справядлівае пакаранне стане табе добрай навукай.

Спыняе позірк на медальёне, які ўпрыгожвае шыю Ганны.

— І колькі разоў табе казала… Не карыстайся гэтым упрыгожваннем. Яно… не пасуе юнай дзяўчыне.

1518 год. У малой зале Кракаўскага каралеўскага палаца сабраліся самыя важныя людзі каралеўства. Гэта першы прыём для эліты, у якім удзельнічае новая каралева — Бона Сфорца.

Уваходзіць кароль Жыгімонт Стары, ён вядзе Бону Сфорцу. Яна прыгожая, з залатымі валасамі, трымаецца ганарліва. У яе сукенкі моднае глыбокае дэкальтэ. Дамы перашэптваюцца.

— Грудзі вываліла… Сораму няма… У іх у Італіі што — усе кабеты так ходзяць?

Кароль і каралева ўсаджваюцца. Усе схіляюцца перад каралеўскай парай. У першых шэрагах — Радзівіл Юры, ягоныя браты Ян Барадаты і Мікалай Радзівіл і сястра Ганна Мазавецкая. Непадалёк Альбрэхт Гаштольд, Канстанцін Астрожскі. Вылучаецца купка італьянскай світы каралевы.

Сярод іх — радца Боны Сфорца, лекар Луіджы Сфорца, у якім пазнаецца Вечны Інквізітар. Сфорца займае месца за крэслам каралевы.

Кароль паварочваецца да Боны:

— Тут сабраліся толькі самыя лепшыя і блізкія да трону. Дазвольце прадставіць вам, каралева, маіх верных паплечнікаў, першых людзей дзяржавы. Альбрэхт Гаштольд, ваявода полацкі… Першым клічу яго, бо толькі што вярнуўся ён з радаснай весткай — яго багатыры разбілі войска вялікага князя маскоўскага!

Да рукі каралевы падыходзіць Альбрэхт Гаштольд. Усе крычаць «Віват!», твар Юрыя Радзівіла крывіцца.

— Канстанцін Астрожскі, вялікі гетман літоўскі! Ён прынёс нам слаўную перамогу пад Воршай!

Канстанцін Астрожскі падыходзіць да рукі каралевы пад «Віваты» прыдворных.

— Мікалай Радзівіл, ваявода Віленскі, вялікі канцлер, уладальнік тытула князя Святой Рымскай імперыі на Мядзелі і Ганёндзах!

Да каралевы падыходзіць Мікалай Радзівіл.

— Юры Радзівіл, мой даўні сябар, па мянушцы Геркулес. Ніводнай бойкі ён яшчэ не прайграў. Няхай жа і ў бойцы за сяброўскія пачуцці маёй каралевы ён не прайграе.

Радзівіл Геркулес падыходзіць да каралевы. Тая зацікаўлена паглядае на магутнага, віднага сабою рыцара. Геркулес прыкладаецца да яе рукі. Гаворыць па італьянску:

— Рады служыць маёй каралеве!

Каралева кідае скосы позірк на Луіджы Сфорца, той ледзь заўважна ківае.

— Мне вельмі патрэбны сябры пры маім новы двары.

Радзівіл пільна глядзіць у вочы каралеве.

— Маё сэрца адкрытае для шчырых пачуццяў.

Жыгімонт Стары працягвае прадстаўляць арыстакратаў.

— Наша добрая суседка, княгіня Ганна Мазавецкая, уладарка слаўнай Мазовіі.

Ганна Мазавецкая ганарыста падыходзіць, нізка кланяецца каралю і толькі лёгка ківае галавой каралеве, як ніжэйшай. Бона Сфорца ўгневаная.

Ганна вяртаецца да братоў. З нянавісцю паглядае на каралеву.

— Гэта я павінна быць на яе месцы. Я не разумею, чаму ён выбраў не мяне. Я прыгажэй. Я магла б прынесці яму ў пасаг Мазовію.

Ян Барадаты ўсміхаецца.

— Можа, каралю не спадабалася гісторыя з тваім каханкам Жэлінскім, сястра? Ты дала той нікчэмнасці такую ўладу, што падданыя паўсталі!

— Я іх уладарка. Я маці двух каралевічаў, удава Конрада Мазавецкага. Яны мусілі цярпець.

Геркулес скептычна круціць галавой.

— А вось кароль не хоча цярпець чыіхсьці выбрыкаў. Хаця з гэтай кабетай…

Юры сустракаецца позіркам з Бонай.

— Думаю, ён пашкадуе, што выбраў не цябе.

Луіджы Сфорца нешта шэпча на вуха каралеве, і тая ўтаропліваецца позіркам у Ганну Мазавецкую. Ганна з выклікам сустракае яе погляд. Блакітныя вочы і брунатныя вочы гараць аднолькавай нянавісцю.

Ганна няголасна кажа братам:

— Я ўсё адно не адступлю. Я слабая ці моцная? Італьянка вызваліць трон для мяне.

Юры Радзівіл пяшчотна прыабдымае сястру, нешта шэпча ёй на вуха. Ганна сціскае яго руку ў пошуку падтрымкі. Бона заўважае гэта. Яе твар на імгненне змяняецца ад гневу. Бона пераводзіць позірк на караля і бачыць, што ён таксама глядзіць на Ганну Мазавецкую з нейкай тугою.

Бона шэпча Вечнаму Інквізітару.

— Гэта жанчына занадта шмат сабе дазваляе. Не спускай з яе вачэй.

Між тым у зале пачынаюцца больш вольныя гаворкі. Каля караля і каралевы ўтвараецца кола просьбітаў і лісліўцаў, астатнія госці пачынаюць хадзіць па зале, размаўляць між сабою. Канцлер Мікалай Радзівіл — ля караля. Каралева час ад часу шукае позіркам Юрыя Геркулеса.

Да Яна, Юрыя і Ганны падыходзіць Альбрэхт Гаштольд. Ён звяртаецца да Яна з ледзь прыхаванай нянавісцю:

— Як ваша сямейнае жыццё, пан Ян?

Барадаты насцярожана глядзіць на Гаштольда.

— Дзякуй, ваша мосць, я шчаслівы.

— Цаной жыцця маёй няшчаснай сястры, вашай былой жонкі?

Ян бянтэжыцца.

— Паслухай, Альбрэхт… Ты несправядліва судзіш. Прысягаю, я не вінаваты ў смерці Лізаветы. Ты ж ведаеш, яна была слабая здароўем…

Гаштольд крывіць вусны.

— Слабая… Не надта ты думаў пра яе, калі з'ездзіў у сваты да Кішак, і замест таго, каб высватаць брату іх дачку, закахаўся ў яе сястру!

— Альбрэхт, у імя былога нашага сяброўства…

— Наша сяброўства з'елі паўтары гады турмы, куды мяне паклёпам засадзіў ваш брат Мікалай. І я нізавошта не паверу, што гэта проста супадзенне — калі ў той самы час ты пачаў пагарджаць маёй сястрой і адкрыта заляцацца да другой кабеты…

Твар Яна Барадатага, разумны, з тонкімі рысамі, адлюстроўвае сапраўдную пакуту.

— Усё не так…

Гаштольд паглядае з нянавісцю.

— Не дарую.

Сыходзіць. Юры Геркулес спачувальна кладзе руку на плячо брату, Ганна Мазавецкая кладзе яму руку на другое плячо. Зверху, невядома адкуль, спускаецца, кружляе пяро гругана.

Цалкам кінааповесць-фантасмагорыю можна прачытаць у № 99 часопіса «Дзеяслоў».

След, вечна жывы

Палуян Сяргей. След, вечна жывы: Творы. Успаміны. Прысвячэнні. Даследаванні / Сяргей Палуян; уклад., падрыхт. тэксту, агляд. аналіт. арт., прадмова і камент. Т. Кабржыцкай, В. Рагойшы. — Мінск: Кнігазбор, 2018. — 336 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка». Выпуск 114).




Аснову выдання складае творчая спадчына самабытнага публіцыста, крытыка, празаіка і паэта Сяргея Палуяна (1891-1910), рупліва сабраная даследчыкамі ва ўкраінскай і беларускай перыёдыцы.

У кнізе ўпершыню найбольш поўна прадстаўлены ўспаміны пра пісьменніка яго родных і знаёмых, мастацкія творы, прысвечаныя яму, матэрыялы пра радаслоўе Палуянаў. Укладальнікі кнігі — Тацццяна Кабржыцкая і Вячаслаў Рагойша — ставяць Сяргея Палуяна поруч з Янкам Купалам, Максімам Багдановічам, Вацлавам Ластоўскім, рашуча і доказна ўпісваюць яго асобу ў панараму гісторыка-філасофскіх, эстэтыка-культурных характарыстык беларускага адраджэння пачатку ХХ ст.

Яблычны пах цішыні

Баторын Фелікс. Яблычны пах цішыні. Вершы і паэмы. Мінск: Кнігазбор, 2018 — 308 с. (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў "Кнігарня пісьменніка". Выпуск 115).



У кнігу ўвайшлі вершы, балады і паэмы, складзеныя Феліксам Баторыным, за адзінкавымі выключэннямі, у 2007–2018 гадах. Значная іх частка публікуецца ўпершыню.

У творах паэта пераважаюць грамадзянская, любоўная, пейзажная лірыка, але гэтым іх тэматыка не вычэрпваецца. Паэтычнай мове аўтара ўласцівыя празрыстая прастата і складаная метафарычнасць, тонкі лірызм, які, пры ўсёй парадаксальнасці, часта арганічна спалучаецца з філасофскімі развагамі, іроніяй і самаіроніяй.

У гэтай кнізе таксама змешчаны пераклады з іўрыту, з ідыш, рускай і нямецкай моў, зробленыя ў нядаўні час.

Я веру ў Цуд

Ваганаў Сяргей. Я веру ў Цуд: вершы розных гадоў (1963–2018) / Сяргей Ваганаў. — Мінск: Кнігазбор, 2018. — 140 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў "Кнігарня пісьменніка"; вып.113).

Вершы, сабраныя ў гэтай кнізе, ствараліся журналістам Сяргеем Ваганавым цягам жыцця, але амаль нідзе не друкаваліся, за выключэннем часопіса "Дзеяслоў", газеты "Народная воля", альманаха "Мішпоха" і Сеціва. Такім чынам, гэта першая паэтычная кніга аўтара, у якой вы знойдзеце і любоўную лірыку, і філасофскую, і грамадзянскую, — на беларускай і рускай мовах. Вершы наўмысна не пазначаны аўтарам канкрэтнымі датамі, бо, як ён мяркуе, вельмі важна ўспрымаць іх з адчуваннем безупыннасці Часу.



Альтэрнатыва для Басі, альбо Не трэба баяцца

Дыпломная работа мусіць паказаць, што студэнт засвоіў матэрыял, які старанна ўкладалі ў яго вушы выкладчыкі цягам навучання. Вось, я стараўся. Умею тое і тое... У гэтым сэнсе дэбютная кніга Кацярыны Захарэвіч — тыповы дыплом.



«Час вогненнага птушкалова» — двухпланавая аповесць. Фантастычная? Магчыма. Калі адштурхоўвацца ад вызначэння, што фантастыка паказвае рэчы нерэальныя. Але ёсць у аповесці не такое заўважнае другое дно, якое значна ўскладняе схематычныя прасты твор. Пра гэта пазней...

Аповесць Кацярыны Захарэвіч з тых тэкстаў, якія маюць вузка акрэсленую аўдыторыю. Не ў тым сэнсе, што іншы прачытаць не здолее. Але ў тым, што найбольшы водгук яна атрымае ў чытача з пэўным наборам рысаў. Гэта мусіць быць чалавек беларускамоўны. Лішняя, здавалася б, пазнака. Але мы да таго звыклі стасавацца ў моўным гета, што перастаем заўважаць відавочнае: далей за нашае кола кніга наўрад ці выйдзе.

Другое — гэта чалавек маладый, лепей сказаць — юны. У слова «юны» ёсць шэраг прычэпаў: узнёсла-палымяны, рамантычны, схільны да драматызацыі. Месцамі сентыментальны. Карацей, аматар гераічнай рамантычнай прозы.

То бок тая ж катэгорыя чытачоў, якая запойна чытае прыгодніцкія раманы Людмілы Рублеўскай і ведае імя Ксеніі Шталянковай.

Вось тут — самае цікавае.

І Ксенія, і Кацярына прайшлі Школу маладога пісьменніка. Школу, у якой выкладае Людміла Рублеўская. З аднаго боку, можна казаць пра ўплыў натуральны: аўтаркі ўпадабалі эстэтычную сістэму Рублеўскай, пераналі і г.д. З іншага — ёсць рызыка, што гэты ўплыў чыста школьны. Чаму рызыка? Таму што спатрэбіцца час, каб зразумець, што гэта менавіта ўплыў, штучнае ўздзеянне, а не асабістае светабачанне.

Калі слушны першы варыянт, можна казаць пра новую літаратурную традыцыю, запачаткаваную некалі яшчэ Караткевічам, перахопленую Дайнекам, Арловым і Рублеўскай, і далей — навучэнцамі Школы пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў.

Але.

Зазвычай у прыгодніцкіх творах акцэнт ставіцца на моцы герояў, іх баявітасці, авантурнасці, адметнасці. Кацярына Захарэвіч падкрэслівае адваротны бок медаля: ейная гераіня — няўклюдная, няўпэўненая ў сабе, яна пачуваецца лішняй. У развіцці сюжэта роля гераіні мінімальная. Яна на пазіцыях ахвяры. Яна разумее несправядлівасць свету, глыбока перажывае, але нічога не робіць. Гэтыя рысы належаць абедзвюм Басям. Рэч у тым, што гераіня мае дзве іпастасі. Першая — рэалістычная: дзяўчына, што жыве ў сучаснасці, пачуваецца самотнай у сям'і і парыяй — у школе. Другая Бася існуе ў паралельнай лініі. Яна паходзіць з «расы» адметных.

Для разумення сітуацыі: Кацярына Захарэвіч распрацавала міні-міф, паводле якога адпачатку існавалі «сапраўдныя» людзі. Адметныя. 121 чалавек, усе — прыгожыя знешне, але даволі млявыя па натуры. Жылі бы ў райскім садзе, цешыліся самі сабе і жыццю. Знайшоўся бунтар, які стварыў големаў для чорнай працы. Адметныя разленаваліся дарэшты і сталі зусім безабаронныя. Карацей, гліняны пралетарыят паўстаў і загнаў адметную шляхту на задворкі жыцця. Вось з гэтых адметных і паходзіць другая Бася.

Кацярына Захарэвіч разгортвае абедзве лініі, але Басі не асабліва змяняюцца. Эвалюцыі гераінь як такой няма. Падзеі — а там і прыгоды, і здрады, і інтрыгі — ёсць, але не пакідае

> **Зазвычай у прыгодніцкіх творах акцэнт ставіцца на моцы герояў, іх баявітасці, авантурнасці, адметнасці. Кацярына Захарэвіч падкрэслівае адваротны бок медаля**

адчуванне, што яны, насамрэч, не маюць асаблівага значэння.

Самыя яркія моманты аповесці — стыкі двух сусветаў. Яны — чыста кампазіцыйныя, то бок ніякіх узаемадзеянняў між светамі няма. Але паралелі — відавочныя. Здрада сяброўкі, пакуты самавызначэння, адсутнасць бацькі, прыўкрасны прынц, у якім нейкі час сумняешся, вобразы дарослых персанажаў — усе яны перагукаюцца.

Вось тут і ўзнікае думка, што другая, фантастычная, лінія — толькі фантазія рэальнай Басі. Гэта самотнае дзяўчо, нікому не патрэбнае і незаўважнае, але надзвычай чуйнае да свету. Замкнёная ў сабе, яна ізалюецца ад рэальнасці і стварае альтэрнатыву. (Згадваецца фан-версія датычна «Гары Потэра», паводле якой свет магіі — хваравітая фантазія самотнага хлопчыка з каморкі). На карысць гэтай версіі — наяўнасць у рэальнай Басі рудога ката (новая тэндэнцыя белліту — уводзіць у твор свайго коціка: Шарова, Янкута...) і блакітнага папугайчыка. З якіх змаляваныя сілы жыццёвага колазвароту ў свеце фантастычным — Вогненны Птушкалоў і Нябёсная Птушка.

І заканчваецца кніга тым, што рэальная Бася ідзе на спатканне. З невідзімкі яна ператвараецца ў жывую дзяўчыну, робіцца існай для іншага чалавека. Фантазіі ёй больш не патрэбныя.

Уменне ўбачыць уласныя комплексы, пераадолець нясмеласць і выцягнуць іх на святло — моцны бок аўтаркі. Гэта жэст насуперак няўпэўненасці, хоць і ў ім самім няўпэўненасць пакідае след.

Сунуцца да аўтараў з парадамі — вельмі смешна, але вельмі хочацца пажадаць Кацярыне не баяцца. Страх зрабіць «не так» бачны ў мове. Усё правільна, гладка, літаратурна. Жаданне зрабіць правільна цягне за сабой празмерную апісальнасць. Гэтая літаратурнасць — як панцыр, абарона ад магчымых заўваг. Але ў тым і справа, што памылкі робяць нас адметнымі. Памылкі і ёсць тое зерне, з якіх вырастае стыль.

На класічнае пытанне «Кім вы сябе бачыце праз N год?» я б сказала — пра Кацярыну: аўтаркай псіхалагічнай прозы для падлеткаў. У дэбютнай кнізе яна не раскрыла гэты свой талент, паставіўшы на кутні камень прыгодніцкую лінію. Неабходнасць вытрымаць тэмп аповеду папросту абкарнала псіхалагічны партрэт герояў. Але ёсць у аповесці месцы, якія недвухсэнсоўна паказваюць здольнасць Кацярыны тонка адчуваць іншага чалавека (чытай: персанажа). І калі другая лінія аповесці сапраўды фантазія гераіні, то сама аповесць з прыгодніцкага чытва ператвараецца ў сур'ёзную псіхалагічную драму (кшталту «Моста ў Тэрабітыю»).

Таму аўтарцы проста неабходна пераадолець страх быць сабой. Страх асуджэння глушыць мастацкі талент. І варта падумаць, што горш насамрэч: пачуць крытыку на свой адрас — ці так ніколі і не раскрыцца, не стаць сабой, не даць поўнай волі таленту?

Наста Грышчук

«заВЕРШАНАЕ» падсумаванне

Першы нумар часопіса «Дзеяслоў» за 2019 год атрымаўся не такім аб'ёмным, як звычайна, затое больш важкім сваім унутраным напаўненнем. Яго зручней чытаць і вальней разважаць над прачытаным. Аптымальна знойдзены фармат.

Нумар запачаткаваны нізкай цудоўных вершаў **Вольгі Гронскай** пад назовам «заВершанае». Яна ўпарта трымаецца той мяжы паэзіі, якая палягае паміж вобразным светам старэйшага і малодшага пакаленняў. Гэта заўважна. Тут, праўда, яшчэ няма поўнага адыходу ад самой сябе, ад арытміі сэрца, прыліваў гарачай крыві, стрыманасці пачуццяў і агаленасці эмоцый, але ўжо ёсць надтрэснутасць, відна лінія расколіны, адчай чаплляння, пераходу-перараскоквання ў свет віртуальны —самаствáральны, абязболены, пралічаны, замяняльны на любы іншы, як штучны пратэз... Вольга яшчэ дыхае боскай прыродай зямнога быцця.

Дарога нібыта сама цябе выбірае
і абяцае прывецсі
да брамы раю.
Ты па ёй крочыш —
і падыходзіш
да краю.
Прэч адляцець
трэба яшчэ вучыцца.
У логаве сэрца —
раненая ваўчыца.
Чым ад халоднага ветру
схаваць ключыцы?..
Піць малако тугі,
выдыхаць,
лячыцца.

Паэт старэйшага пакалення **Віктар Ярац** (адзін з тых, хто поплеч з Алесем Разанавым змагаўся за беларускамоўнае выкладанне на філфаку БДУ напрыканцы 1960-х) прапануе чытачам паэму «Зіма без мамы», якая складаецца з паасобных вершаў заяўленай тэматыкі. Вершы элегічныя і рацыянальныя, аднак жывыя; аўтар спрабуе паўторна прайсці сцежкамі мацярынскага і ўласнага родавага лёсу.

Боль загоіцца — чым
пытае днём і ноччу душа, — да яе
голас мамы з глыбіняў расстання
праз маўчання пласты дастае.

Чарговае апавяданне **Вінцэся Мудрова** «Дом творчасці» — гэта гіпертрафіраваная іронія адносна (каля)літаратурнага працэсу канца 1970-х. Мне падалося, што фарбы аўтарам настолькі згушчаныя, што рэаліі мінулага праглядваюцца празмерна карыкатурна і, пэўна, выклічуць недавер не толькі ў тых, хто меў «шчасце» быць хай сабе ўмоўным прататыпам апісаных падзей. У тэксце фігуруе пісьменніцкі Дом творчасці Камарышчавічы (Караліщавічы), куды накіраваны малады пачынаючы паэт з правінцыі для творчага «пад'ёму»... Але з чым ён там сутыкаецца? З поўнай дэградацыяй. Гурт старэйшых літаратараў-п'янтосаў, якія толькі тым і займаюцца, што пасылаюць ганца ў горад па «чарніла», п'юць і рэжуцца ў карты... З'ўленне дзвюх жанчын сітуацыю яшчэ больш ускладняе. Ні аднаго больш-менш прасветленага героя. Ды нават і сам галоўны герой на гэтым фоне выглядае камічна. (Безумоўна, было і такое ў жыццёвых праявах сацрэалізма, але ж не наскрозь і не пагалоўна, як паказана ў гэтым тэксце.)

«— Ён ехаў сюды, думаў, пісьменнікі авангард нацыі, хвараюць душой за лёс мовы. Маюць нейкія ідэалы і перакананні, прагнуць, нарэшце, ісціны, а аказалася, што вас апроч ганарараў...

— Ну-ну, працягвай, — перабіў Падгурскі, — цікава паслухаць вось такіх — маладых ды неаб'езджаных. Сам быў такім калісьці.

— Вы сваёй бяздарнасцю, п'янкамі і звычайным халуйствам давялі літаратуру да ціхага сконy, — успыхнуў Юрась, забыўшыся скончыць папярэднюю фразу.

— Малады яшчэ, каб старэйшым указваць, — з інтанацыяй лаянкі выдаў Падгурскі, — калі такі ідэйны, дык чаго сунешся на дармавы сняданак, ды яшчэ ў кампаніі з літаратурнымі прыстасаванцамі?»

Чытаючы тэкст, увесь час круціцца пытанне: а хто ж пісаў тыя творы нашай нацыянальнай літаратуры, якія сталі яе класічным скарбам? Цікава, а каб з такога ракурса і з такім сатырычным імпэтам зірнуць на сучасны літпрацэс? На мой погляд, карціна выглядала б не менш саркастычна...

На гэтым фоне аптымістычнымі (у сэнсе творчага росту) падаюцца абразкі ад **Зараславы Камінскай.** Добрая мова, чысты літаратурны стыль, лірычная паддаплёка, што ствараюць адзіную жыццясцвярджальную аўру.

Новая нізка вершаваных тэкстаў **Вольгі Гапеевай** — гэта своеасаблівыя метафарычныя пасылы да чытачкай свядомасці з надзеяй дачакацца пэўнага водгуку. Як мне думаецца, такія аўтарскія спадзевы недарэмныя.

цяперашні час даецца мне цяжка
мінулы ведаю лепш
так і жыву
вось бы як у кіно
страціць памяць
і тыя хто там прапісаўся
не маючы майго на тое дазволу
тады кожную згадку буду спакойна здымаць
як волас з пляча паліто
не здолеўшы прыгадаць ужо
чыйны

На маё меркаванне, лепшая проза нумара па глыбіні і мастацкім раскрыцці заяўленай тэмы — гэта апавяданне «Бомж» **Сцяпана Сяргея.** У экстравагантнай сітуацыі нечакана сутыкаюцца два былыя сябры-аднакурснікі. Адзін — бізнесовец, другі — бомж. Ёмкая, у меру экспрэсіўная проза — спроба філасофскага погляду на сучаснае чалавечае і грамадскае жыццё. Два героі, дзве супрацьлегласці, якія ніяк не могуць знайсці кропкі сутыкнення, што маглі б прымірыць іх стаўленне да ўзаемаадносін людзей у свеце, альбо хоць паразумецца ім дваім у гэтым іхнім прыватным выпадку...

« — Чалавек заўсёды знойдзе сабе апраўданне. А калі ён яшчэ і адукаваны, то падвядзе пад гэта цэлую філасофію, возьме ў адвакаты Платона, Ніцшэ. І так запудрыць мазгі і сабе, і другім, што хоць ты помнік пры жыцці яму стаў. А, між іншым, ісціна не ў мудраванні, не ў сафістыцы, а ў простых, зразумелых нават непісьменнаму чалавеку запаведзях: не ўкрадзі, не забі, не сведчы лжыва... — гэта тое, аб чым ты нядаўна хацеў сказаць, успамінаючы Хрыста.

— Штосьці, дарагі ты мой, пачаў сам сабе супярэчыць. Толькі што сцвярджаў, што ісціна ў віне, а зараз загаварыў пра боскія запаведзі, — Касцюкевіч засмяяўся, наліў поўныя чаркі.

— А адно другому не пярэчыць, — крутнуў галавою Толя. — Наадварот, першае дапамагае больш поўна і востра ўспрымаць і адчуваць другое.

— Магчыма і так. Але ўсё ж з адным я пагадзіцца не магу. З тваіх слоў можна зрабіць выснову, што ўсе багатыя — нягоднікі, а бедныя — анёлы. А жыццё паказвае, што сярод бедных людзей нягоднікаў не менш, чым сярод багатых. Проста бедны нягоднік можа атруціць жыццё толькі сваім блізкім, а багаты, ды яшчэ пры ўладзе, — тут, вядома, маштаб другі.»

Друкуюцца ў новым часопісе вершы сёлетняй лаўрэаткі прэміі імя Міхася Стральцова *Анхелы Эспінoсы Руіс.* Пэўна ўсе ўжо ведаюць, што гэта маладая іспанка з Малагі, якая вывучыла і выдатна ведае беларускую мову. Нават піша на ёй вершы. Гэта эмацыйна-пачуццёвая грамадзянская ды інтымная лірыка — як удзячнасць лёсу за гэтую «беларускую праяву» ў яе душы і сэрцы.

Называлі мяне тут паэткай,
легендай, прарокам,
Быць прарокам няможна
на роднай зямлі.
Беларускую мову, відаць,
толькі цэняць здалёку,
І стагоддзе назад вы яе
сапраўды прадалі.

Два гістарычныя апавяданні гарадзенца **Віктара Варанца** займальныя і чытэльныя. Ну, каму падасца абыякавай яшчэ адна гісторыя з росшукам расейскага імперскага золата, якое захапіў Напалеон! Яно на дне Бярэзіны ці ў таемнай скарбніцы езуітаў? Не менш захапляльны і расповед пра справы шпіёнскія і «гусарскі (публічны) дом» з выведкай і прастытуцыяй... напярэдадні вызвалення Заходняй Беларусі...

Нізка вершаў ураджэнкі Гайнаўкі (Польшча) **Кацярыны Сянкевіч** адчувальна сухаватая. Тэксты пераважна здуманыя.

без цябе мае думкі
— кіслая рака крыві
з табою маё сэрца
наперад гоніць
салодкія рэкі

Мастак і паэт **Рыгор Сітніца** у гэты разам выявіў сябе ў іпастасі драматурга. Драма ў дзвюх дзеях з пралогам і эпілогам называецца «Фармат Вечнасці». Хаўтуры па творцу (мастаку, пісьменніку, архітэктару) Душа Мікалаю. Адпаведны шэраг прысутных узгоднены з пратаколам. Дзейства адбываецца як у рытуальнай зале і за жалобным сталом, так і ў віртуальным пазачасавым і пазапрасторавым *фармаце,* дзе *мёртвыя* могуць быць жывымі, а жывыя *мёртвымі*... Ці прымірающь грэшных людзей той і гэты свет? Драматычны тэкст захопліваe і не адпускае да канца драмы. Мяркую, што пры магчымай таленавітай рэжысёрскай пастаноўцы ўражанне ад спектакля будзе яшчэ больш яскравым.

Празаічныя творы пераможцаў конкурсу «Экслібрыс» да 100-годдзя БНР, якія друкуюцца ў гэтым нумары, зразумела, маюць гістарычны і грамадска-палітычны характар, як у сюжэтным, так і ў ідэйным (нацыянал-патрыятычным), і ў вобразным выяўленні. Сярод аўтараў: **Яўген Ансарэўскі, Зміцер Астроўскі** і **Андрэй Кулеш.**

Як заўсёды, у часопісе моцны і арыгінальны падбор перакладной літаратуры. Гэтым разам вядомага літоўскага паэта **Томаса Вянцлаву** прадстаўляе наш не менш вядомы перакладчы **Лявон Баршчэўскі.** Нізка вершаў называецца «Пейзаж з Паліфемам». У літоўцаў мой кумір Імантас Зыедоніс, але, скажу вам, і Вянцлава мала ў чым яму саступіць.

Улетку часта, прачнуўшыся на світанку,
я адчуваю без страху набліжэння часу,
калі прыйдуць новыя пакаленні
і ўсё ад нас пяроймуць: слоўнік, неба, соль, хлеб, а мне застанецца
адно свабода.

Выдатныя іранічна-сцiслыя апавяданні класіка амерыканскай літаратуры **О. Генры** чытаюцца на адным дыханні ў адмысловых перакладах маладой **Сашы Сайкоўскай.**

Многімі чытаны віцебскі сатырык-іраніст **Міхась Міраповіч** прапануе ў сваіх перакладах адмысловыя «непрычасаныя думкі» **Станіслава Ежы Ленца.** Вось адна, датычная нас, смяротных, думка: *«Адзін сваёй творчасцю будуе сабе надмагільны помнік, другі капае сабе магілу».*

А вось пераклад аб'ёмнага даследавання «Вёскі Камаровічы ў Мазырскім павеце» гжэчнай польскай шляхцянкай **Эмай Яленскай** (пісьменніцай і фальклaрыстам-этнографам), зроблены вядомым фальклярыстам Уладзімірам Васілевічам, на мой погляд, проста падарунак як чытачам, так і беларускім навукоўцам. Гэты, на першы погляд, пабытавы, з падрабязнымі ўзгадкамі духоўнай і матэрыяльнай культуры, нарыс (1891–1892) будзе прачытвацца кожным глыбока нацыянальным чалавекам, як «ойча наш» усяго нашага прамінулага, але, на шчасце, не забытага. Тут падрабязна апісана ўсё: самі палешукі, іх жыццё, будовы, звычкі, абрады, рэчы, адзенне, праца, побыт... Ну, вось, да прыкладу хоць бы гэты фрагмент:

«Само памяшканне палескай хаты пры святле лучніка ўяўляе сапраўды маляўнічае відовішча. Нейкі водар старажытнасці, даўно мінулых гадоў сыходзіць з гэтага зацішнага свету, для якога чужымі здаюцца агульначалавечыя, грамадскія і палітычныя інтарэсы і які пра тое, што хвалюе ўсю астатнюю Еўропу, не мае найменшага ўяўлення і зусім не прагне вырвацца з гэтага зачараванага кола, спрадвеку яшчэ распачатага продкамі. Наглядзеўшыся на цывілізаваныя краіны, на адукаваныя народы, цяжка паверыць, што гэтая палеская хата ці яе жыхары, усе гэтыя прыстасаванні і ўвесь гэты першабытны лад сапраўды існуюць пасярод зменлівага еўрапейскага грамадства на схіле XIX стагоддзя. Такія гэтыя людзі яшчэ простыя, самародкавыя, наіўныя, поўныя дзіцячай абаяльнасці і такія блізкія да першабытнай прыроды!»

Выдавец, паэт і празаік **Кастусь Цвірка** працягвае занатоўваць сваё ўласнае і грамадскае жыццё. У тым ліку і літаратурнае, і культурніцкае. Гэтым разам у нарысе «Мой дзве тысячы шаснаццаты» гаворка ў асноўным вядзецца вакол працы над выданнем 200-томнай серыі «Беларускага кнігазбору».

Філосаф **Валянцін Акудовіч** працягвае сваю справаздачную «хроніку беларускага інтэлектуала» і прапануе запісы пра дзейнасць «Бум-Бам-Літа», якія, як мяркуецца, дададуцца да зместа яго будучай кнігі «Трэба ўявіць Сізіфа шчаслівым».

Літаратуразнаўца **Таццяна Кабржыцкая** ў сваім эсэ распавядае пра жыццёвы лёс і творчасць «волата ўкраінскага Адраджэння» Клімента Квіткі (1880–1953), мужа Лесі Украінкі.

Таленавіты **Васіль Дранько-Майсюк** дасціпна і абгрунтавана піша пра творчае жыццё драматурга Уладзіслава Галубка, спрабуючы вызначыць і высвавáць мастацкі плён ягоных рэжысёрскіх пакутаў. Эсэ называецца «...Душагуб беларускай сцэны».

Пра (цяпер ужо сталічны раён) «Грушаўку і Падгрушша» піша ў сваім эсэ **Вольга Бабкова,** *ціхая* самасная пісьменніца з тонкім вычуваннем акаляючых рэчаў і ўнутранага стану чалавека.

Эсэ **Марыны Яўсейчык** пра тое, што ўсе мы ходзім пад Богам, а вось пакідаем гэты свет не ўсе і не заўсёды па Яго волі, але нярэдка і насуперак ёй, — па волі забойцаў, следчых, пракурораў і пракуратараў... Жыццё даецца кожнаму, а ўласная смерць не ўсякаму... Эсэ пра лёсы, згадкі і здагадкі людзей, якія былі прысуджаны да смяротнай меры пакарання. *«Расстрэл можа стаць развязкай у жыццёвай гісторыі толькі для чалавека, пазбаўленага жыцця. Для яго родных расстрэл — гэта кульмінацыйны момант у няскончанай гісторыі роду, пасля якога іх чакае працяг — незваротна зменянае ўласнае жыццё.»*

Уладзімір Сіўчыкаў успамінае пры свайго настаўніка малявання мастака і педагога Уладзіміра Макарава.

Найбольш яркімі запісамі пра літаратуру і мастацкую творчасць пад агульным назовам «Мой чытацкі лёс» са сваёй фэйсбучнай фрэндстужкі дзеліцца з чытачамі часопіса літаратуразнаўца і крытык **Павал Абрамовіч.**

Леанід Галубовіч разважае над старонкамі кнігі выбранай паэзіі Міколы Пракаповіча «Прытулак памяці».

Напрадвесні лепшага чытання для абуджэння душы і розуму і не падбярэш.

ЛеГал

ПРЭМІІ

Дзве нобелеўскія літпрэміі за год

Шведская акадэмія афіцыйна абвесціла, што гэтай восенню будуць уручаны дзве Нобелеўскія прэміі па літаратуры: за 2018 і 2019 гады.

Пасля пасяджэння Нобелеўскі фонд, які выконвае волю-запавет Альфрэда Нобеля, абвясціў, што «крокі, якія Шведская акадэмія распачала і збіраецца распачаць, створаць добрыя магчымасці для аднаўлення даверу» і што будуць абвешчаныя лаўрэаты на 2018 і 2019 гады.

Нагадаем, што пасля скандалу з разгалошваннем інфармацыі пра лаўрэатаў і абвінавачванняў у сэксуальным гвалце мужа аднаго з членаў Акадэміі, некаторыя акадэмікі выйшлі з яе складу, хоць іх сяброўства было пажыццёвым.

У сакавіку мінулага года новы пастаянны сакратар Шведскай акадэміі Андэрс Олсан абвесціў аб адтэрміноўцы прысуджэння прэміі, заявіўшы, што арганізацыі неабходна засяродзіцца на «ўзнаўленні грамадскага даверу» з-за таго, што яна разгледзела шэраг абвінавачванняў у сэксуальным гвалце, вылучаных супраць Жана-Клода Арно, мужа члена Акадэміі Катарыны Фростэнсан. Арно быў асуджаны за згвалтаванне і прысуджаны да турэмнага зняволення ў мінулым кастрычніку.

Значнымі зменамі ў прэміі стала прызначэнне пяці незалежных і знешніх членаў, якія дапамогуць Шведскай акадэміі выбраць нобелеўскіх лаўрэатаў «на наступныя некалькі гадоў». Тое, як выбіраецца пераможца, доўгі час было сакрэтам, які старанна ахоўвалі: вядома, што ў лютым Акадэмія разгледзела каля 200 намінацый, а да траўня быў вызначаны кароткі спіс. Яшчэ пяць аўтараў былі вызначаны летам. Архівы, у якіх падрабязна выкладаецца матывацыя журы, раскрываюцца для знешняга свету толькі праз 50 гадоў пасля падзеі.

Найбуйнейшая літаратурная прэмія Аўстраліі

Як паведаміла выданне «The Guardian», іранскі аўтар Бехруз Бучані, які шукае палітычнага прытулку, атрымаў найбуйнейшую аўстралійскую літаратурную прэмію.

Аднак сам лаўрэат, які сумарна атрымаў 125 тысяч долараў у намінацыі «Non-fiction prize» і «Victorian prize» за літаратуру і «Victorian premier's literary awards-2019», не прысутнічаў на цырымоніі, паколькі з'яўляецца вязнем турмы на востраве Мануса.

У адпаведнасці з жорсткай іміграцыйнай палітыкай Аўстраліі асобы, якія шукаюць прытулку і якія спрабуюць трапіць у краіну на лодцы, «апрацоўваюцца» ў афшорных цэнтрах.

Бехруза Бучані, чыя дэбютная кніга атрымала як навукова-папулярную прэмію (25 тысяч даляраў), так і галоўны прыз за літаратуру ў памеры 100 тысяч даляраў, не пускаюць у Аўстралію. Курдска-іранскі пісьменнік просіць палітычнага прытулку, яго амаль 6 гадоў трымаюць на «чысцы» на востраве Мануса ў Папуа-Новай Гвінеі — спачатку за сеткай аўстралійскага афшорнага цэнтра ўтрымання пад вартай, а затым у альтэрнатыўным жыллі на востраве.

А цяпер яго кніга «Няма аднаго, акрамя гор», складзеная з тэкставага паведамлення з цэнтра заключэння, была прызнана ўрадам той жа краіны, якая адмовіла яму ў доступе… Гэта, паводле выказвання пісьменніка, «парадаксальнае пачуццё».

Сам аўтар распавёў «The Guardian»: «Я, вядома, не пісаў гэтую кнігу проста дзеля таго, каб атрымаць узнагароду. Мая заўсёдная галоўная мэта — каб людзі ў Аўстраліі і ва ўсім свеце глыбока разумелі, як гэтая сістэма здзекавалася з нявінных людзей у Мануса і Науру на працягу амаль шасці гадоў. Я спадзяюся, што гэтая ўзнагарода прыцягне больш увагі да нашай сітуацыі, прывядзе да зменаў і да завяршэння гэтай варварскай палітыкі».

Ад імя Бучані ўзнагароду атрымаў яго перакладчык Амід Тафігян, які працаваў сумесна з перакладчыкам Мунсом Мансубі над тэкстам Бучані пры перакладзе з фарсі на ангельскую.

Прэмію ў галіне мастацкай літаратуры атрымала Эліз Вальморбіда за раман «Мадона гор» («The Madonna of the Mountains»).

Кендал Фівер быў узнагароджаны ў намінацыі «Драма» за п'есу «Усемагутны зрэдку» («The Almighty Sometimes»), а Кейт Лілі атрымала прыз у намінацыі «Паэзія» за зборнік «Цілт» («Tilt »).

Кім Скот атрымала прэмію за «Табу» («Taboo») у намінацыі «Літаратура абарыгенаў».

Вікторыя Ханна ўзнагароджана ў намінацыі «Неапублікаваныя рукапісы» (прыз у памеры 15 тысяч долараў) за «Кокамо» («Kokomo»), а Бры Ці выйграла прыз глядацкіх сімпатый за мемуары «Чэрап з яечнай шкарлупіны».

Серыя паштовак, прысвечаных пісьменніцам

Выдатная калекцыя «SHE» з 100 мастацкіх паштовак, натхнёных знакамітымі жанчынамі-пісьменніцамі, была прафінансавана на краўдфандынгавай платформе «Kickstarter» напрацягу сутак.



Больш за 500 спонсараў папярэдне замовілі калекцыю (на памяць) з дапамогай розных узнагарод, якія яны атрымаюць да ліпеня.

«SHE-art» — гэта візуальная ода жанчынам-пісьменніцам, якія сваім словам зрабілі значны ўплыў на будучыя пакаленні чытачоў. Элегантныя ілюстрацыі прыцягваюць увагу да вялізнага ўнёску знакамітых пісьменніц.

Калекцыя «ўключае ў сябе» па дзве з 100 паштовак: адну — для захоўвання і адну — для адпраўкі поштай. Яны аддрукаваныя на дарой паперы з выдатнай якасцю друку і захоўваюцца ў падарункавай скрыніцы, якую можна пакласці на кніжную паліцу або часопісны столік, і з'яўляюцца выдатным калекцыйным прадметам для ўсіх, хто любіць мастацтва і літаратуру, а таксама ўнікальным падарункам для аматараў кніг і мастацтва.

Калекцыя паштовак «SHE-art» упершыню была выдадзена ў 2017 годзе і складалася з 24 ілюстрацый. Яна атрымала шырокі водгук у энтузіястаў, прымусіўшы сузаснавальнікаў кампаніі «Obvious State» імкнуцца да большага, а поспех першага праекта натхніў на пашырэнне калекцыі.

Першая экранізацыя «Ста гадоў адзіноты»

Паводле паведамлення «плыневага» інтэрнэтсэрвіса «Netflix», ён атрымаў правы на першую экранізацыю найбольш вядомай кнігі калумбійскага пісьменніка, Нобелеўскага лаўрэата Габрыэля Гарсіі Маркеса. Упершыню будзе зняты серыял па матывах рамана «Сто гадоў адзіноты».



У паведамленні адзначаецца: « "Netflix" набыў правы на шэдэўр Габрыэля Гарсіі Маркеса «Сто гадоў адзіноты» і адаптуе яго да вытворчасці ў серыі. Гэта першы і адзіны раз за больш чым 50 гадоў існавання рамана, калі сям'я аўтара дазволіла адаптаваць праект для экрана».


Як паведаміла выданне «Variety», здымкі серыяла пройдуць пераважна ў Калумбіі — на радзіме літаратара. Таксама вядома, што сыны пісьменніка — Радрыга Гарсія Барч і Гансала Гарсія Барч — будуць выканаўчымі прадзюсарамі серыяла. Пра іншыя падрабязнасці праекта пакуль не паведамлялася.

Паводле слоў Радрыга Гарсія, яго бацька дзесяцігоддзі адмаўляўся прадаваць правы на экранізацыю «Ста гадоў адзіноты» з прычыны абмежаванасці кінафільмаў у часе, а таксама патрабаванняў экранізацыі толькі на іспанскай мове. Сын сусветна вядомага літаратара адзначыў: «Аднак менавіта цяпер, у залаты век серыялаў, калі ўзровень сцэнарнага і рэжысёрскага таленту такі высокі, а гледачы ва ўсім свеце з задавальненнем спажываюць кантэнт на замежных мовах, гэта стала магчыма».

Раман «Сто гадоў адзіноты» Габрыэля Гарсіі Маркеса, 92-я гадавіна з дня нараджэння якога адзначалася 6 сакавіка, быў апублікаваны ў 1967 годзе. За яго, а таксама і іншыя творы, пісьменнік быў уганараваны Нобелеўскай прэміяй па літаратуры.

Кніга-рэкардсмен 2018 года ў ЗША

Аўтабіяграфія былой першай лэдзі ЗША займае першыя радкі рэйтынгаў па продажах.



Кніга «Станаўленне» (або «Becoming» у арыгінальным варыянце назвы) — моцная і неверагодна цікавая аўтабіяграфія, напісаная для людзей і пра людзей. Мішэль Абама паўстала ў сваім звычайным амплуа і акцэнтавала ўвагу на тым, што жыццё яе і гісторыя — такія ж, як і тысяч іншых амерыканцаў.

Продажы «Станаўлення» пабілі рэкорд, усталяваны бэстсэлерамі ЗША з 2012 года.

У першыя тыдні продажаў выдавецкі дом «Penguin Random House "Becoming"» быў вымушаны дадрукоўваць новыя асобнікі, але пры гэтым слухаў «стогны ўладальнікаў кніжных крам у ЗША»: «Кніга скончылася, рабіце ж што-небудзь!».

Менавіта гэтая кніга стала перамožцам у ролі калядната падарунка: яе набывалі мамам і жанчынам, падлеткам і босам у кампаніях, калегам і, нарэшце, проста куплялі сабе.

«Галоўная "разыначка" аўтабіяграфіі ў тым, што Мішэль не выдумала ні слова — усё праўда», — пішуць чытачы. «Аўтарка адкрытая і неверагодна харызматычная. Апошняя ўеёй ці не больш, чым у мужа, які дамогся такой неверагоднай пасады і з гонарам вытрымаў усе выпрабаванні!», — дадаюць іншыя.

«"Станаўленне" — гэта не ўсё жыццё, а толькі яго адрэзак. Я не маю намеру спыняцца, бо наперадзе яшчэ вельмі шмат цікавага!», — сказала Мішэль Абама на адной з прэзентацый сваёй кнігі ў Амерыцы.

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by